ШАНЦ ДЛЯ ВЁСКІ

КОД ДА ПАМЯЦІ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 ЛІПЕНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 145 (29767)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

КАРОТКА

• Беларусь за студзень — май экспартавала прадукцыі на $2,8 мільярда. Гэта на 14 працэнтаў вышэй за мінулагодні ўзровень.

• Сафія і Міхаіл узначалілі рэйтынг самых папулярных імёнаў дзяцей у Мінску.

• Абмежаванні і забароны на наведванне лясоў уведзены ў 25 раёнах Беларусі. Па актуальнай інфармацыі, у лясных масівах Магілёўскай, Мінскай і Віцебскай абласцей можна бываць свабодна.

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый МАТУСЕВІЧ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці:

«Ужо больш за тры дзесяцігоддзі Беларусь з'яўляецца дзяржавай, у аснове палітыкі якой — дабрабыт чалавека і дастойныя ўмовы яго жыцця. За апошнія гады ў краіне дасягнута нямала значных поспехаў у розных сферах. Яны сталі вынікам узважаных і дакладных кіраўніцкіх рашэнняў, якія прымаюцца дзяржавай, а таксама агульнай працы і ініцыятывы людзей. Дзяржкамаёмасць, калі казаць аб рэалізацыі курсу на пабудову IT-краіны і лічбавізацыі, валодае шырокім спектрам сучасных тэхналогій. Ведамства на пастаяннай аснове стварае і ўдасканальвае інфармацыйныя сістэмы і рэсурсы, якія забяспечваюць высокую якасць аказання паслуг грамадзянам і задавальняюць запатрабаванні галін нацыянальнай эканомікі і бяспекі».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ПЫТАННЕ ПАСПЯХОВАЙ УБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ ДЛЯ БЕЛАРУСІ — СТРАТЭГІЧНАЕ»

На сувязі — уся краіна. Як у Прэзідэнта абмяркоўвалі жніво

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў селектарную нараду па пытаннях уборачнай кампаніі 2022 года. У Палацы Незалежнасці сабраліся прадстаўнікі ўрада, кіраўнікі розных міністэрстваў і ведамстваў. Па відэасувязі падключыліся губернатары, кіраўнікі ўсіх 118 раёнаў і іх намеснікі, дырэктары сельгаспрадпрыемстваў.

Фота БелТА.

Беларускі лідар адразу растлумачыў, чаму была абрана менавіта такая форма работы. Ён падкрэсліў, што сітуацыя ў свеце вельмі няпэўная. «У сувязі з ашалелай гэтай сітуацыяй у свеце, калі шчыра казаць, мы не ведаем, што будзе заўтра. І гэта самае небяспечнае. Шмат хто кажа, што мы напярэдадні голаду. Мы гэта адкідаць не будзем і задаём сабе пытанне: «А раптам?»

СТАР. 2–3

Справа тэхнікі

Кірыл ВАРАБ'ЁЎ сёлета скончыў сярэднюю школу і адразу пасля выпускнога вечара прыйшоў на работу ў СВК «Мазалаўскі» Мсціслаўскага раёна ўладкоўвацца слесарам па рамонце сельскагаспадарчай аўтатрактарнай тэхнікі. А на час жніва, якое днямі пачалося, працуе памочнікам камбайнера. У планах учарашняга школьніка — не толькі зарабіць свае ўласныя грошы, але і паступіць у Мінскі дзяржаўны аўтамеханічны каледж, аб якім ён марыць з дзявятага класа.

— Як толькі скончыцца жніво, паеду ў сталіцу, — кажа юнак. — Хочацца быць высокакваліфікаваным спецыялістам, працаваць на аўтасэрвісе.

У «Мазалаўскім» на працягу дваццаці гадоў працуе трактарыстам яго бацька, ад якога Кірыл яшчэ ў дзяцінстве засвойваў урокі абыходжання з трактарамі і камбайнамі; дапамагаў, калі псавалася тэхніка — можна сказаць, набываў прафесіянальны досвед. Нездарма юнаку і даверылі работу слесара. А на жніве Кірыл у маладзёжным экіпажы працуе разам з механізатарам Аляксандрам Беляньковым.

Гэтае фота я зрабіў, калі хлопец правяраў механізмы «Палесся», на якім збіраўся выйсці ў поле жаць новы ўраджай.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Ёсць пытанне!

«РАБОТА — ГЭТА БОЛЬШ, ЧЫМ ГРОШЫ»

Але як яе знайсці, калі табе больш за 50?

Здаецца, увесь свет адчуў, што цяперашнія 50-гадовыя — гэта былыя 35-гадовыя. Не зразумелі толькі супрацоўнікі кадравых службаў, якія па-ранейшаму навешваюць на суіскальнікаў, старэйшых за 45 гадоў, зневажальны ярлык «узроставыя». З якімі цяжкасцямі даводзіцца сутыкацца пры працаўладкаванні людзям, што па класіфікацыі СААЗ прадстаўляюць сярэдні ўзрост — 45—59 гадоў, расказалі яны самі.

«Па-старому вы ўжо пенсіянерка»

Ірына трапіла ў лік тых, хто пасля COVID-19 і яго наступстваў мяняў работу на лягчэйшую альбо наогул браў паўзу ў працоўнай дзейнасці. Пра адноснае аднаўленне здароўя можна было казаць праз тры месяцы. Пачаліся пошукі работы. Па спецыяльнасці не атрымлівалася. Таму Ірына разглядала работу маркіроўшчыка ці стыкероўшчыка, але ўсюды першае і апошняе пытанне было пра ўзрост.

Вось такі дыялог пераказала Ірына:

— Жанчына, вы разумееце, што па-старому вы ўжо пенсіянерка? — пытаецца спецыяліст па кадрах.

— Але жывём мы па-новаму і на пенсію сыходзім у 58 гадоў.

Толькі адна супрацоўніца па падборы персаналу далікатна папярэдзіла аб тым, што пасля офіснай работы працаваць на складзе будзе вельмі цяжка: «Мы ўжо сутыкаліся з тым, што людзі хацелі памяняць сферу дзейнасці, але максімум, што яны вытрымлівалі, — пару тыдняў».

Адміністратар цырульні, спецыяліст па выпісцы накладных, прыёмшчык заказаў — усюды адмовы. Усюды «маладыя дружныя калектывы» не маюць патрэбы ва «ўзроставым» прэтэндэнце.

«Ад фінансавай падушкі бяспекі не засталося нічога, — кажа жанчына. — Мне ўжо ўсё роўна, якая работа, галоўнае, каб я магла яе выконваць».

Па даных сэрвісу rabota.by, у чэрвені бягучага года каля 11,8 % карыстальнікаў сайта знаходзілася ва ўзросце ад 45 да 54 гадоў, яшчэ 14,5 % — ва ўзросце 55+.

СТАР. 4

«ПЫТАННЕ ПАСПЯХОВАЙ УБОРАЧНАЙ ДЛЯ БЕЛАРУСІ — СТРАТЭГІЧНАЕ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі голад — вы ведаеце яго наступствы, таму нам трэба сабрацца. Гасподзь падарыў нам цудоўныя ўмовы надвор'я. І мы павінны гэта скарыстаць. І што вельмі важна, калі мы спрацуем сёлета добра, мы зможам прыстойна зарабіць і паправіць эканоміку сельскай гаспадаркі. Словам, сітуацыя вельмі сур'ёзная і, я сказаў бы, надзвычайная з пункту гледжання арганізацыі работы ў вёсцы», — задаў тон нарады Прэзідэнт. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, крытычная сітуацыя на сусветным харчовым рынку толькі пагаршаецца. Кадры пшанічных палёў, спецыяльна падпаленых баявымі верталётамі паўднёвых суседзяў, нікому не дадаюць аптымізму. Аднак, звярнуў ён увагу, гэта толькі вяршыня айсберга. ***«Бяздумныя санкцыйныя абмежаванні на ўгнаенні, энераносьбіты і разрыў прывычных транспартных сувязяў паставілі многія краіны на мяжу выжывання. Зіма блізка. І для тых, хто не зможа сябе пракарміць, гэта будзе халодная і галодная зіма».*** — падкрэсліў Прэзідэнт. У сувязі з гэтым пытанне паспяховай уборачнай кампаніі для Беларусі — стратэгічнае.

«Мы павінны забяспечыць насельніцтва харчаваннем, павялічыць нашы стабілізацыйныя фонды — запасы на будучыню. А таксама, маючы сёння добрыя цэны на харчаванне, паправіць эканоміку сельскай гаспадаркі. Тым больш што ўсё для таго, каб дасягнуць гэтых мэт, у нас ёсць. У Беларусі вырашчаны добры ўраджай збожжавых і зернебабовых культур. Хоць цяперашнее жніво няпростае», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён заўважыў, што сёлета надвор'е прынесла нямала сюрпрызаў. Нямала палеглых пасеваў. Масавая ўборка сёлета пачалася на тыдзень пазней, чым звычайна. Прэзідэнт канстатаваў, што трэба выкарыстоўваць кожнае імгненне, каб паспець у тэхналагічныя тэрміны. Таксама на час жніва прыпадаюць другі ўкос шматгадовай травы, уборка лёну, сяўба паржышчавых культур. Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што ў кароткі перыд часу неабходна кардынальна паскорыць усе працэсы з мэтай забяспечыць і якасную нарыхтоўку кармоў, і ўборку збожжа без страт, а таксама рыхтавацца да сяўбы азімых.

«Перспектывы на ўраджай нядрэнныя. Як запэўніваюць спецыялісты, прагназуецца, што валавы збор збожжа, уключаючы рапс, кукурузу, свірэпіцу складзе каля 10 мільёнаў тон. З-за ўмоў надвор'я цяпер тэмпы ўборкі збожжа яшчэ невысокія. Цешыць ураджайнасць ячменю, у сярэднім больш за 50 цэнтнераў з гектара. Неабходна аддаваць больш увагі гэтай культуры (павялічваць плошчу, абавязкова выконваць тэхналогіі)», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Дысцыпліна і адказнасць павінны быць на найвышэйшым узроўні»

Прэзідэнт падкрэсліў, што вёсцы аказана ўся неабходная дапамога: паліва, тэхніка, фінансавыя рэсурсы. Таму ад усіх, у першую чаргу ад кіраўніка да механізатара, патрабуецца максімальная аддача. Інакш будуць страты. А гэта недапушчальна. «Страты — гэта ўгнаенне глебы грашыма», — канстатаваў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, галоўныя патрабаванні на бягучы ўборачны перыяд — тэмпы і якасць. Ён зрабіў акцэнт на тым, што дысцыпліна і адказнасць павінны быць на найвышэйшым узроўні.

«А з гэтым, як мне паведамляюць Камітэт дзяржаўнага кантролю і Генеральная пракуратура, не ўсё так гладка. Многія кіраўнікі падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі папросту завалілі. У асобных арганізацыях тэхніку нават не пачыналі рамантаваць. Фактычна кожны 10-ы камбайн не гатовы да работы. Няма механізатараў, кажуць. Як няма, мы ж яшчэ восенню мінулага года дамаўляліся, што трэба з гарадоў запрасіць на работу былых камбайнераў, іх нямала. Нехта ўчора пайшоў на пенсію, з задавальненнем прыйдзе і дапаможа на ўборцы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён расказаў, што не ўсюды працуюць элеватары і склады для захоўвання збожжа. Прычым такое высветлілася пры праверцы ў кожнай чацвёртай гаспадаркі. Прыпіскі па гатоўнасці тэхнікі і зернесушыльных комплексаў установлены на 40 сельгаспрадпрыемствах. ***«Гэта не проста безадказнасць з боку мясцовай улады — гэта харчовая дыверсія. Менавіта так гэта будзе расцэньвацца.*** А я неаднаразова даручаў ураду і аблвыканкамам за зіму прывесці ў парадак усю тэхніку. У канцы мінулага года такое даручэнне давалася міністру прамысловасці. Чаму не выкананы мае даручэнні?» — спытаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, практычна ў кожнай другой з праверaных гаспадарак устаноўлены факты парушэння тэхналагічных рэгламентаў нарыхтоўкі кармоў. «А кармы, не мне вам расказваць, — аснова для атрымання малака і мяса», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што па выніках праведзеных праверак установлена: у 277 сельскагаспадарчых арганізацыях усіх рэгіёнаў краіны зніжэнне тэмпаў уборкі траў стрымліваецца з-за нясправаўнасці кормаўборачнай тэхнікі. Факты нізкай гатоўнасці ўстаноўлены ў 130 гаспадарках, а ў некаторых рамонт распачалі толькі перад самым пачаткам работ.

«Пра якую выканальніцкую дысцыпліну можа ісці гаворка, калі з году ў год міліцыя выяўляе п'яных на рабочым месцы», — падкрэсліў ён. Паводле інфармацыі МУС, пры правядзенні пасяўной і ўборачнай кампаній складзена каля 700 пратаколаў, у тым ліку больш за 100 — за допуск да кіравання ў нецвярозым стане. «Мяркую, трэба падумаць усім нам, якія меры прымаць да такіх людзей. Самыя жорсткія», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Уборка хлеба — справа ўсенародная»

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што так працаваць людзі не павінны і не будуць. Таму адказным у краіне за аграпрамысловы комплекс ён задаў наступныя пытанні.

Па-першае, якая рэальная абстаноўка з уборкай на месцах? Ці ёсць нявырашаныя пытанні? Па-другое, чаго не хапае для высокай гатоўнасці збожжаўборачнай тэхнікі?

«Паводле інфармацыі ўрада, у цэлым па краіне гатоўнасць збожжаўборачных камбайнаў складае прыкладна 90 працэнтаў. Пры гэтым у Віцебскай і Магілёўскай абласцях гэты паказчык толькі на ўзроўні 73 працэнтаў. Якая патрэбна дапамога?» — запытаў Аляксандр Лукашэнка.

Па-трэцяе, якая арганізоўваецца сушка збожжа? Гатоўнасць зернеачышчальна-сушыльных комплексаў у сярэднім складае крыху больш за 90 працэнтаў. У Віцебскай і Магілёўскай абласцях — толькі 80. «Як наладжана работа па выкарыстанні вытворчых магутнасцяў камбінатаў хлебапрадуктаў? Нагадваю, што прыёмку і дапрацоўку збожжа трэба ажыццяўляць кругласутачна. Пры любой вільготнасці. З пастаўшчыкамі разлічвацца своечасова», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

Па-чацвёртае, дзяржзаказ на збожжа павінен быць безумоўна выкананы. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, гэта ўжо не праблема. «Паводле папярэдняй інфармацыі, збожжа сёлетняга ўраджаю прыдатнае для высакаякаснага хлебапячэння. Таму неабходна зрабіць закупкі ў аб'ёме поўнай патрэбнасці. Пры гэтым калі збожжа якаснае і, калі трэба, гэтыя закупкі зрабіць з запасам», — растлумачыў ён. Прэзідэнт звярнуў увагу, што трэба стварыць базу для выканання праграмных задач у АПК, нарыхтаваць зернефураж для жывёлагадоўлі з улікам патрабаванняў рацыёнаў, якія забяспечваюць высокі ўзровень прадукцыйнасці па малаку і мясе.

Па-пятае, працоўныя кадры. «Уборка хлеба — справа ўсенародная. Як вы дакладваеце, плануецца прыцягненне амаль трох тысяч механізатараў, у тым ліку 1,3 тысячы камбайнераў. Задзейнічаныя на ўборачнай кампаніі павінны быць забяспечаны ўсім неабходным, а іх праца — дастойна аплачана. Асабліва гэта датычыцца камбайнераў, ад якіх залежыць якасць уборкі», — удакладніў Прэзідэнт.

Па-шостае, парадак і дысцыпліна. Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу, што тут важнае ўсё. Засцярога ўборачнай і зернесушыльнай тэхнікі, палёў ад пажараў. Забеспячэнне захаванасці намалочанага збожжа ад поля да свірна. ***«Сіламі міліцыі трэба поўнасцю перакрыць усе магчымыя каналы крадзяжу паліва і збожжа пры ўборцы.*** Забяспечыць захаванасць падчас транспарціроўкі. Выключыць выпадкі п'янства, дабівацца жалезнай дысцыпліны. Я думаю, пракуратара і МУС прымуць адпаведныя меры», — сказаў ён. Па словах беларускага лідара, адмысловая роля тут у Камітэта дзяржаўнага кантролю. «Аператыўна прымаць дзейсныя меры па ліквідацыі парушэнняў і інфармаваць урад і пры неабходнасці мяне аб выяўленых фактах зрыву тэмпаў або зніжэння якасці ўборкі збожжа», — даручыў Прэзідэнт.

Па-сёмае, аказанне своечасовай дапамогі сялянам. На прыватных падворках 65 тысяч гектараў засеяна збожжавымі культурамі. А гэта каля 200 тысяч тон збожжа ў агульнарэспубліканскі каравай. ***«У першую чаргу дапамагчы пажылым і адзінокім, якім больш няма на каго спадзявацца. Камбінатам хлебапрадуктаў трэба пры неабходнасці зрабіць закупку лішкаў збожжа ў сялянскіх і фермерскіх гаспадарках. Разлічыцца своечасова»,*** — паставіў задачы кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што мэта нарады — вырашыць усе пытанні, якія могуць быць. «Памятайце, ад вашага арганізатарскага таленту, умення мабілізаваць людзей і строга спыняць парушэнні залежыць харчовая бяспека Беларусі», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, падчас уборачнай кампаніі дарагая кожная хвіліна. «Асабліваць такая, што збожжавыя і каласавыя, асабліва рапс, не пачакаюць. Калі мы дзень-два празяваем, ураджай будзе на зямлі, асыплецца, таму мы ўдзяляем увагу гэтым відам сельскагаспадарчай прадукцыі. Яшчэ раз падкрэслю: у свеце сітуацыя вельмі сур'ёзная. Таму ***па-вясковаму, па-сялянску мы павінны быць гатовыя да горшага. Будзе лепшае — і нам будзе нядрэнна.*** Папярэджваю ўсіх прысутных, усе павінны быць гатовыя адказаць на пытанні і праінфармаваць усіх, хто знаходзіцца на месцах, аб тых мерах, якія мы прымаем і гатовыя зрабіць для якаснай уборкі ўраджаю», — сказаў Прэзідэнт.

Гатоўнасць тэхнікі вышэйшая, чым летась

З дакладам аб ходзе ўборачнай кампаніі выступіў **віцэ-прэм'ер Леанід ЗАЯЦ.** Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў яго, як прамысловыя прадпрыемствы дапамагаюць рамантаваць складаную энерганасычаную тэхніку. Па словах Леаніда Зайца, усе пытанні вырашаліся своечасова. **Міністр прамысловасці Пётр ПАРХОМЧЫК** расказаў, што яго галіна выканала ўсе абязацельствы па своечасовых пастаўках запчастак і буйных вузлавых рамонтах і прадаўжае кантраляваць сітуацыю. Міністэрства прамысловасці абяцала паставіць некалькі трактароў і збожжаўборачных комплексаў, такая работа вядзецца, і ў найкарацейшыя тэрміны яны будуць накіраваны ў гаспадаркі. **Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар БРЫЛО** пацвердзіў, што ўсе неабходныя запасныя часткі пастаўлены ў поўным аб'ёме ва ўсе вобласці краіны.

Паводле інфармацыі Камітэта дзяржаўнага кантролю, сёлета гатоўнасць тэхнікі вышэйшая, чым летась. Аднак гэта не значыць, што трэба згладжваць і спрашчаць сітуацыю. Праведзеныя на бягучым тыдні кантрольныя мерапрыемствы паказалі асобныя факты прыпіскаў па некаторых раёнах. Асобныя гаспадаркі ў 2,5 раза прыпісваюць гатоўнасць.

«Калі два міністры заяўляюць, што праблем няма і ўсё вырашана, я вас папрашу выбарачна паглядзець сітуацыю ў краіне», — даручыў кіраўнік дзяржавы Камітэту дзяржкантролю.

«Вапнаванне глебы — гэта наш хлеб»

Падчас нарады сваім меркаваннем аб сітуацыі з уборкай ураджаю падзяліўся **генеральны дырэктар НПЦ па земляробстве Фёдар ПРЫВАЛАЎ.** Ён падкрэсліў, што на большую ўраджайнасць глеб і якасць пасеваў уплывае актыўнае вапнаванне глеб. У апошнія гады інтэнсіўнасць гэтых работ зніжалася. Прэзідэнт звярнуў на гэта ўвагу віцэ-прэм'ера Леаніда Зайца. «Меліярацыя і вапнаванне глебы — гэта наш хлеб, гэта дзяржаўная работа. Не трактары купляць для калгасаў, саўгасаў і гэтак далей. А менавіта ўрадлівасць глебы — пытанне нумар адзін для нас, для дзяржавы», — падкрэсліў ён.

Асобную ўвагу ўдзельнікі нарады ўдзялілі практычным аспектам уборкі рапсу. Абмеркавалі, як максімальна знізіць магчымыя страты і забяспечыць высокую ўраджайнасць. Па словах Фёдара Прывалава, у цэлым сітуацыя на палях нядрэнная. Крыху стрымліваюць тэмпы ўборкі перыядычныя дажджы, але яны важныя для іншых культур, сярод якіх і цукровыя буракі, і кукуруза, і бульба.

Асобна Аляксандр Лукашэнка засяродзіў увагу на забеспячэнні жывёлагадоўлі бялковымі кармамі, селекцыйнай рабоце ў дадзеным напрамку, атрыманні ўласнага насення і вырошчванні адпаведных культур. Фёдар Прывалаў адзначыў перавагі сої, якую ў эксперыментальным парадку высяваюць у Беларусі. Гэтая паўднёвая культура прывыкла да больш кароткага светлавога дня. У беларускіх умовах нядрэнна апрацоўваць традыцыйныя культуры — гарох, лубін. Але і сою айчыннай спецыялісты не скідаюць з рахунку. ***«Нам трэба глядзець на перспектыву. Мы сотні мільёнаў долараў трацім на закупку бялковых культур — сої і іншага. Трэба гэта вырошчваць у сябе.*** Таму што без бялку нікуды. І разлічваць на тое, што мы завязём і купім, не даводзіцца. Ніхто не прадасць. А калі прадасць, гэта будуць шалёныя цэны», — звярнуўся Прэзідэнт да віцэ-прэм'ера Леаніда Зайца.

«Насцярожваюць Гомельская і Віцебская вобласці»

Пра ход уборачнай кампаніі ў сваіх рэгіёнах далажылі старшыні абласных выканаўчых камітэтаў. Прэзідэнт даручыў узяць на асаблівы кантроль сітуацыю ў Гомельскай і Віцебскай абласцях, паколькі, па яго словах, гэтыя рэгіёны больш за ўсё яго насцярожваюць. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што віцэ-прэм'ер Юрый Назараў і старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Крупко паабяцалі прыняць усе магчымыя меры і вывесці рэгіён на добры ўзровень. Прэзідэнт звярнуў увагу, што ўраджайнасць асобных культур у рэгіёне занізкая. Гэтае пытанне актуальнае і для Віцебскай вобласці.

КАМПАНІІ

Пра сітуацыю ў аграпрамысловым комплексе паўночнага рэгіёна далажыў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар Брыло. Прагноз у яго аптымістычны: усе праблемы — па нарыхтоўцы кармоў, раслінаводстве, вытворчасці малака, птушкагадоўлі і жывёлагадоўлі — вырашаюцца. Аднак, як падкрэсліў у сваім дакладзе **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН,** пасля 10-гадовага выкарыстання са строю выходзіць да 60 працэнтаў парка камбайнаў. «Таму мінімум сотню камбайнаў нам даводзіцца абнаўляць штогод. Гэтае пытанне мы цесна адпрацоўваем з урадам. Акрамя таго, сёлета мы дасталі ўсе камбайны, нават тыя, якія не працавалі два-тры гады, і з іх запчастак сабралі новыя», — сказаў ён. Губернатар падкрэсліў, што калі Камітэтам дзяржкантролю будуць выяўлены факты парушэнняў, расследаванні правядуць сур'ёзна, а вінаватыя будуць пакараныя.

«Я хачу, каб вы пры ацэнках і развагах памяталі элементарнае: ***міліцыя атрымала даручэнне — калі не будзе забяспечана нармальнае захоўванне тэхнікі, нават няхай не разлічваюць, што мы будзем дапамагаць.*** Калі няма машыннага двара і магчымасці абслугоўваць гэту тэхніку, няма дзесяці ці пяці класных механізатараў — вы нават не прасіце», — папярэдзіў Прэзідэнт.

Губернатары абласцей расказалі Прэзідэнту пра свае праблемы ў сельскай гаспадарцы. Так, аграрыям Брэстчыны не хапае камбайнаў, а Гомельшчыне патрэбна паліва для арганізацыі восеньскіх палявых работ. Кіраўнік дзяржавы даручыў прапрацаваць гэтыя пытанні. «Мы вас будзем падтрымліваць па тэхніцы па мінімуме, таму што дзяржаве трэба займацца сваімі пытаннямі: перш за ўсё меліярацыяй. І ***падтрымліваць па тэхніцы будзем толькі тых, хто навучыцца захоўваць гэту тэхніку. Па паліве: мы сёлета пастараемся дапамагчы. Але майце на ўвазе, гэта не дабрачыннасць, за ўсё трэба разлічвацца».*** — сказаў ён.

Пра сітуацыю ў Магілёўскай і Гродзенскай абласцях кіраўнікі рэгіёнаў расказалі Прэзідэнту на мінулым тыдні. Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што ў найбліжэйшы час плануе асабіста азнаёміцца з ходам уборачнай кампаніі ў Мінскай вобласці.

«Памрыце, але пакладзіце на стол тое, пра што дамовіліся»

У канцы нарады беларускі лідар расставіў акцэнты, з якімі сёлета павінна прайсці ўборачная кампанія. Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў, што ўзровень вытворчасці ў сельскай гаспадарцы сёлета не можа быць ніжэйшы за ўзровень 2021 года. «Персанальная адказнасць прэм'ер-міністра, міністра сельскай гаспадаркі і старшынь аблвыканкамаў», — папярэдзіў ён. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што па выніках першага паўгоддзя адзначаецца некаторае зніжэнне вытворчасці сельгаспрадукцыі. Ён падкрэсліў, што сёлета няма аб'ектыўных прычын для падзення паказчыкаў у сельскай гаспадарцы.

Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што будзе аказана дапамога і па паліве, і па крэдытах, каб з сялянамі разлічыцца за збожжа і за іншую прадукцыю. «Але ад вас: памрыце, але пакладзіце на стол тое, пра што мы дамовіліся. Калі вы яшчэ 4 % дадасцё, ну будзеце проста малайцы. Вось такая галоўная задача», — рэзюмаваў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што жнівень і верасень трэба прысвяціць вёсцы. Ён заявіў, што горад павінен дапамагчы ёй настолькі, наколькі гэта трэба: палівам, грашыма і людзьмі. Асобна кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на арганізацыю працэсу: ***«Патрэбны вынік, а вынік — гэта дысцыпліна. І працэс павінен быць арганізаваны ад поля да прылаўка».***

Яшчэ адна праблема — перапрацоўка і захоўванне сельскагаспадарчай прадукцыі, так званыя стабілізацыйныя фонды. «Уся гэтая размова ў імя таго, каб сабраць ураджай, нарыхтаваць неабходную прадукцыю і, як у нас прынята казаць, закласці ў стабфонды на зіму. Не толькі на зіму. Калі будзе добры ўраджай, дапусцім, па збожжавых, то трэба на будучае назапасіць», — сказаў Прэзідэнт. Ён упэўнены, што цэны на сельгаспрадукцыю ў свеце будуць толькі расці, і таму важна забяспечыць запасы, каб па прымальных цэнах рэалізаваць прадукцыю на ўнутраным рынку ў міжсезонне.

«Ніякай запазычанасці быць не павінна»

Прэзідэнт паабяцаў губернатарам, што яны атрымаюць грашовыя рэсурсы, каб разлічыцца з сялянамі. ***«Ніякай запазычанасці перад калгасамі, саўгасамі, фермерамі, сельгаспрадпрыемствамі быць не павінна.*** Камітэт дзяржкантролю возьме на кантроль гэтае пытанне. Гэта надзвычайнае здарэнне, калі мы своечасова не разлічыліся з сялянамі. Прашу, каб міністр фінансаў гэта пачуў. Здымайце з любых артыкулаў, уносьце прапанову, але за хлеб трэба разлічыцца», — запатрабаваў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы даручыў на месцах дакладна вызначыць тактыку ўборкі, каб забяспечыць максімальны ўраджай і не дапусціць страт. «Прыбірайце пры вільготнасці 20 %. Можа быць, нават 22 %. Лепш падсушыце. Таму што гэта ўсё роўна будзе рэнтабельна. Вы нават не ўяўляеце, наколькі будзе попыт на прадукцыю сельскай гаспадаркі, у тым ліку і на збожжа. Але мы збожжа на экспарт прадаваць не збіраемся. Нам трэба яго прапусціць праз жывёлагадоўлю, атрымаць малако, мяса і іншае. І гэтую прадукцыю прадаць на міжнародных рынках», — заявіў ён.

Асобна Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што аграрыі павінны быць галоўнымі героямі ў сродках масавай інфармацыі.

«Вельмі вас прашу, давайце дастойна правядзём гэтую ўборку, каб у будучыні жыць спакойна. Каб ні ў якім разе не дакацілца да таго, што адбываецца на поўдні ад нашай краіны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Валерыя СЦЯЦКО.

Духоўнае

АД МАНАШКІ НАСТАССІ ДЫ ІЗЯСЛАВА

Урачыстасці з нагоды святкавання 1030-годдзя праваслаўнай царквы на беларускіх землях 28 ліпеня прыме Заслаўе

У гэты дзень жыхароў горада чакае насычаная святочная праграма. Горад рыхтуецца прыняць больш за тысячу гасцей, якія могуць узяць удзел у богаслужэнні на адкрытым паветры, што пачнецца на тэрыторыі храма Праабражэння Гасподняга ў 9.30. Богаслужэнне ўзначаліць Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін.

— Увесь гэты год, адметны для беларускага праваслаўя, царква адзначае шэрагам мерапрыемстваў, сярод якіх 5 чэрвеня адбыўся Дзень памяці прападобнай Еўфрасінні. Наступная дата — памяць святога раўнаапостальнага князя Уладзіміра, з іменем якога звязана хрышчэнне Русі ў 988 годзе. Яно стала выходным пунктам тых падзей і працэсаў, якія прывялі ў 992 годзе да з'яўлення ў Полацку епіскапскай кафедры, што па сутнасці было адміністрацыйным афармленнем царкоўнага жыцця. Стварэнне асобнай епархіі сведчыла пра тое, што хрысціян было даволі шмат. Заслаўе абралі для свята 28 ліпеня невыпадкова. Горад заснаваў у 985 годзе князь Уладзімір і аддаў сыну Ізяславу і яго маці Рагнедзе. Разам з Полацкам і Туравым Заслаўе стала адным з цэнтраў распаўсюджвання хрысціянства на нашых землях, — тлумачыць **старшыня сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы іерэй Ігар ВАСЬКО.** — Важнасць святкавання 1030-годдзя праваслаўнай царквы ў Беларусі для сучаснага грамадства ў тым, што праваслаўе зрабіла ўплыў на фарміраванне нашай сістэмы каштоўнасцяў, выбудавала маральную сістэму каардынат.

Менавіта таму далучыцца да богаслужэння ў Заслаўі зможа кожны: дастаткова ўключыць прамую трансляцыю на «Беларусь-3» ў 10.00. Рыхтуецца выстаўка «Сувязь часоў» з унікальных фотаздымкаў храмаў, артэфактаў і археалагічных раскопак. Гісторыкам дагэтуль ёсць над чым працаваць, узнаўляючы падзеі часу, калі Рагнеда-Гарыслава з сынам вярнулася на тыя землі, дзе жыў яе народ. Тут яна стала манашкай з іменем Настасся, пра што памятаюць у Заслаўі, якое атрымала назву ў гонар сына Рагнеды Ізяслава.

— Першая епіскапская кафедра на беларускіх землях была заснавана ў 992 годзе ў Полацку ў ліку 10 епархій, якія ўзніклі на Русі ў канцы X — XI стагоддзі. Пра такія падзеі, як скіданне паганскіх багоў, крышчэнне агнём і мячом, якія на першым этапе суправаджалі прынясце хрысціянства ў Кіеве і Ноўгарадзе, у Полацку невядома, — адзначае **Валянціна ЦЯПЛОВА, гісторык, прафесар Мінскай духоўнай акадэміі.** — Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што палітыка полацкага князя Ізяслава, з іменем якога звязанае распаўсюджванне хрысціянства на беларускіх землях, для таго суровага часу вылучалася незвычайнай мяккасцю і памяркоўнасцю. Верагодна, падобным чынам дзейнічала духавенства, якое прыбыло разам з ім, епіскап, імя якога крыніцы не захавалі.

Горад Заслаўе ўсяго толькі на сем гадоў старэйшы за праваслаўе на беларускіх землях, яму сёлета спаўняецца 1037 гадоў, заўважыла **Ірына ЦІХОНКА, намеснік старшыні Мінскага раённага выканаўчага камітэта.** Традыцыі праваслаўя з 992 года тут умацоўваліся, і на сённяшні дзень у Мінскім раёне 49 прыходаў Беларускай праваслаўнай царквы, 3 благачынні, 32 храмы, якія дзейнічаюць, яшчэ 16 храмаў — на стадыі будаўніцтва. Колькасць прыхаджан павялічваецца, таму і цікавасць да свята чакаецца вялікая. Улады клапоцяцца пра тое, каб было дастаткова транспарту для людзей, якія захочуць наведаць горад 28 ліпеня, тым больш што праграма вялікая і ў большай ступені сямейная. Будуць арганізаваны выстаўкі рамеснікаў, манастырскіх майстэрняў; лячэбныя спектаклі тэатра «Батлейка», інтэрактыўныя гульні, прэзентацыі кніг. Увечары на галоўнай плошчы горада адбудзецца вялікі канцэрт з удзелам Архіерэйскага хору Свята-Духава кафедральнага сабора Мінска, мужчынскага хору «Усіхсвяцкі», капэлы «Санорус», Дзяржаўнага камернага хору, Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Харошкі» і ансамбля танца Заслаўскай школы мастацтваў. Для тых, хто цікавіцца гісторыяй Заслаўя, будуць арганізаваныя экскурсіі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Прыёмная кампанія — 2022

Абітурыентаў прываблівающь псіхалогія і інфармацыйныя тэхналогіі

24 ліпеня ў большасці вышэйшых навучальных установаў завяршыўся прыём дакументаў на бюджэтную форму навучання, а таксама на платную (па спецыяльнасцях, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты). Некаторыя ВНУ ўжо падзялілі папярэднімі вынікамі прыёмнай кампаніі.

Так, у Беларускім дзяржаўным універсітэце на дзённую бюджэтную форму навучання пададзена 3721 заява пры плане прыёму 2175. Сярэдні конкурс склаў 1,7 чалавека на месца. Колькасць абітурыентаў, якія ўдзельнічаюць у агульным конкурсе і маюць сумарны бал вышэйшы за 300, — 67 %. З іх 100 чалавек атрымалі на ЦТ 100-бальны вынік. На спецыяльнасцях, па якіх праводзяцца ўнутраныя іспыты, склаліся наступныя конкурсы: «дызайн» (напрамак — камунікатыўны) — 10,8 чалавека на месца пры плане прыёму — 10; «дызайн» (напрамак — дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя) — 5,5 чалавека на месца пры плане прыёму — 10; «дызайн» (кірунак — дызайн касцюма і тканін) — 4 чалавекі на месца пры плане прыёму — 6; «правазнаўства» (на скарочаную форму) — 2,7 чалавека на месца пры плане прыёму — 10.

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце на 885 бюджэтных месцаў было пададзена 2058 заяў, такім чынам сярэдні конкурс у гэтай ВНУ склаў 2 чалавекі на месца.

Сёлета на некаторыя спецыяльнасці максімальны прахадны бал у педуніверсітэце склаў больш за 300 пунктаў: гэта, у прыватнасці, «лагапедыя», «псіхалогія», «практычная псіхалогія». А самы высокі конкурс зафіксаваны на спецыяльнасцях «выяўленчае мастацтва» (5 чалавек на месца), «псіхалогія» (4,1 чалавека на месца), «аздараўленчая і адаптыўная фізічная культура» (3,6 чалавека на месца). Педагагічную прафесію ўсё часцей выбіраюць юнакі. Так, на факультэце фізічнага выхавання сярод тых, хто прэтэндуе на навучанне, 69 % хлопцаў, на гістарычным — 53 %, на фізіка-матэматычным — 42 %.

У БДУІР самая папулярная спецыяльнасць сёлета — «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій».

На дзённую бюджэтную форму навучання ў БДУІР пададзена 1460 заяў пры плане прыёму — 1077 чалавек. На тэхніка-тэхналагічны профіль паступіла 1388 заяў (план прыёму — 1047). На 30 бюджэтных месцаў на эканамічных спецыяльнасцях хочуць паступіць 72 абітурыенты. Сёлета было выдзелена 26 месцаў для мэтавага набору. Жадаючых вучыцца на такіх умовах — 28 чалавек. Абітурыенты БДУІР маюць магчымасць пры падачы заявы ў прыёмную камісію выбіраць і расстаўляць свае прыярытэты. Калі абітурыент не праходзіць па балах на першую ўпадабаную спецыяльнасць, згаданую ў прыярытэтах, то ўдзельнічае ў конкурсе на другую, трэцюю і гэтак далей.

«Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» — як і летась, самы папулярны напрамак сярод абітурыентаў — 268 заяў на 53 месцы.

Спецыяльнасць «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» (ФКСІС) заняла другое месца — пададзена 133 заявы на 65 бюджэтных месцаў. А замыкае тройку спецыяльнасць «аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі» (ФІТК). На першым месцы сярод прыярытэтаў яе ўказалі ў сваёй заяве 123 абітурыенты пры плане прыёму 60 чалавек. Адзінаццаць абітурыентаў універсітэта па колькасці набраных балаў трапілі ў прамежак ад 391 да 400. Абсалютнай рэкардсменкай сярод усіх беларускіх абітурыентаў стала Анастасія Більдзь. У суме ў яе атрымаўся максімум — 400 балаў. Яна і яшчэ дзевяць абітурыентаў, якія набралі больш за 390 балаў, паступаюць на факультэт камп'ютарных сістэм і сетак. Яшчэ адна абітурыентка выбрала факультэт камп'ютарнага праектавання.

Гэтымі днямі ў вышэйшых навучальных установах праходзяць унутраныя іспыты. Залічэнне на бюджэт у большасці ВНУ пройдзе да 4 жніўня. У Ваеннай акадэміі, Інстытуце пагранічнай службы, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС, на ваенных факультэтах — да 29 ліпеня. Прыём дакументаў на навучанне на ўмовах аплаты для абітурыентаў, якім не трэба здаваць унутраныя ўступныя іспыты, працягваецца да 8 жніўня.

Дадатковы набор на месцы, што засталіся вакантнымі на бюджэтнай форме навучання, пройдзе з 5 да 7 жніўня. Інфармацыю аб наяўнасці вакантных месцаў можна будзе знайсці на сайтах вышэйшых навучальных устаноў.

Скончыцца прыёмная кампанія ў ВНУ 10 жніўня — у апошні дзень залічэння на платную форму навучання.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«РАБОТА — ГЭТА БОЛЬШ, ЧЫМ ГРОШЫ»

«Пачынаеш адставаць ад жыцця...»

З Ганнай не працягнулі кантракт, калі ёй споўнілася 54 гады, гэта значыць да літары закона не прычэпішся.

«Першая думка — дзякуй, што звольнілі. Муж прапанаваў адпачыць. Падцягнула ўсе хатнія справы, знайшоўся час больш чытаць, — дзеліцца жанчына. — А потым раптам скарацілі мужа, якому на той момант было 58 гадоў. Праз месяц ён перастаў шукаць работу па спецыяльнасці, потым адмаўлялі і ў рабочых прафесіях. Мы так зразумелі, што паслужны спіс таксама перашкаджаў атрыманню месца якога-небудзь грузчыка-камплектоўшчыка.

Маё рэзюмэ часцей за ўсё нават не праглядалі. Грошы ў нас былі, у крайнім выпадку дапамаглі б дзеці. Але я выразна зразумела, што работа — гэта больш, чым грошы. Як бы ты ні займаў сябе дома, без работы ўсё роўна пачынаеш неяк адставаць ад жыцця».

Ганна без работы сумавала, калі не сказаць чэзла. Куды ахвотна запрашалі на работу, дык гэта ў менеджары па продажу ўсялякіх цудадзейных сродкаў: «Ну не магу я прапаноўваць людзям тое, што сама ніколі не куплю». Суседка шыпела: гора ты не бачыла, а так бы пайшла і гандлявала.

«Мне здаецца, я ненавідзела людзей, якія ішлі раніцай на работу, зайздросціла мужу, што ён, нарэшце, уладкаваўся, — дзеліцца Ганна. — Увогуле, трэба было або браць сябе ў рукі, або ісці да псіхолага. Разглядала варыянты перанавучання, але што потым? Цяпер, дарэчы, з'явіўся новы від бізнесу: калі за грошы вучаць нібыта з перспектывай працаўладкавання, а потым даюць паперкі, што праслухаў курс, і ідзі з імі куды хочаш».

Ганна апавясціла ўсіх, што шукае работу, нават далёкіх знаёмых. Дапамога прыйшла менавіта з боку былой калегі, з якой у маладосці не вельмі і ладзілі. Затое цяпер жанчыны нават пасмейваюцца,

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

настолькі тыя праблемы здаюцца выдуманымі з вышыні пражытых гадоў.

«Прапанова калегі — мой шчаслівы выпадак, — кажа Ганна. — Людзі нашага веку і рабочых прафесій, як падалося, асаблівых цяжкасцяў з працаўладкаваннем не маюць, а вось «белым каўнерыкам» вельмі складана. Але чаму чалавек з вышэйшай адукацыяй і добрым вопытам павінен ісці ў вахцёры — менавіта гэта мне прапаноўвала «разгледзець» юная кадравічка, калі я абівала парогі ў пошуку работы».

«Яна ўсё вырашыла, калі ўбачыла лічбу «1966»

Кажуць, мужчынам работу знайсці лягчэй. Жыве стэрэатып, што 45-гадовая жанчына едзе з рынку, а мужчына на гэтым рынку яшчэ на ўсю моц весяліцца. Яўгену, праўда, 56 гадоў.

«Мне падабаецца мая прафесія, заўсёды заставаўся ў ёй, нават стаўшы адміністратарам, — дзеліцца мужчына. — Цяпер падумаў, што прыйшоў час папрацаваць проста спецыялістам. Адна «эйчар» (або кадравік) казала, што ім патрэбны амбіцыйныя супрацоўнікі, а я, маўляў, гатовы пайсці на паніжэнне ў параўнанні з тым, што меў. У яе сядзіць у галаве «кар'ерны рост», і яна не разумее, што ўсё трымаецца на моцных і стабільных прафесіяналах, а не толькі на перспектыўных і мэтанакіраваных. Яны папрацуюць год-два і зноў пойдуць шукаць абяцаны ім кар'ерны рост.

У другой арганізацыі быў шакіраваны некампетэнтнасцю кіраўніка структурнага падраздзялення.

У трэцяй фірме была вакансія кіраўніка па маім профілі, але там спецыялістка адмовіла: маўляў, калектыў малады, цяжка будзе знайсці агульную мову з калегамі. Ёй было зусім нецікава, які ўзрост быў у маіх папярэдніх падначаленых. Яна ўсё вырашыла, калі ўбачыла лічбу «1966». А яшчэ паведаміла, што ў іх усё камп'ютарызавана. Калі сказаў, што ўжо трыццаць гадоў за «кампом», дзяўчына ўпала ў ступар. І як мантру паўтарала пра работу ва ўмовах шматзадачнасці. На простае пытанне: якія задачы даводзіцца вырашаць адначасова, нічога адказаць не змагла, але і на другі этап сумоўя не дапусціла».

Увесну Яўгена абралі старшынёй садаводчага таварыства: «Мне падабаецца гэтая работа, бачу вынік, павагу суседзяў. Зарплата 700 рублёў, зімой — 350. Гэта не тыя грошы, на якія можна годна жыць. Але я рады, што хоць бы такая работа ёсць, фарміруюцца новыя сувязі і, спадзяюся, што ўсё наладзіцца. Яшчэ добра, што мая жонка ставіцца да сітуацыі з разуменнем, як той казаў, не пілуе».

Досвед важнейшы за ўзрост

«Пошук новай работы — гэта таксама своеасаблівая работа, якой суіскальнікі 50+ часцяком грэбуюць. Вядома, цяжка перастроіцца і пачаць усё нанава, асабліва калі на папярэднім месцы займаў вядучую пасаду», — кажа **кар'ерны кансультант Юлія ТАРСУНОВА.**

Найперш трэба вызначыцца з тым, што менавіта шукае суіскальнік: сферы дзейнасці, прыдатныя прафесіі. Калі ж чалавек хоча знайсці работу ў нейкай новай кампаніі, то спачатку трэба ацаніць свае магчымасці і зразумець: ці здольны ён навучацца, адаптавацца і прымаць умовы работы ў новым калектыве.

А далей схема пошуку не будзе адрознівацца ад суіскальнікаў іншага ўзросту: стварэнне рэзюмэ і размяшчэнне яго на тэматычных сайтах, вывучэнне вакансій і водгукі, магчыма зварот па дапамогу ў працаўладкаванні ў дзяржаўную службу занятасці, а таксама апавяшчэнне знаёмых і сваякоў аб пошуку работы.

Кансультант звяртае ўвагу, што пры вывучэнні вакансій важна глядзець не толькі на ўмовы работы, але і на патрабаванні да суіскальніка. Не выключана, што спатрэбіцца праходжанне дадатковага навучання, напрыклад пэўнай камп'ютарнай праграмы.

Ёсць шэраг вакансій, для якіх вопыт важнейшы за ўзрост: бухгалтары, аўдытары, натарыусы, юрысты, псіхолагі. Таксама ў любым узросце будуць запатрабаваныя вузкапрофільныя эксперты, напрыклад у вытворчасці, медыцыне, фармацэўтыцы. Што датычыцца прафесій, звязаных з продажамі і суправаджэннем кліентаў, варта разгледзець такія сферы, дзе ўзрост мэтавай аўдыторыі ці асоб, якія прымаюць рашэнні на баку кліента, будзе таксама 50+.

Калі ў суіскальніка сярэдняя спецыяльная адукацыя і экспертыза ў вытворчым сектары, падыдуць вакансіі выкладчыкаў, майстроў, настаўнікаў.

Часам і няпрофільны вопыт можа стаць новай работай. Напрыклад, добра валодаючы замежнай мовай, можна ўладкавацца перакладчыкам ці стаць выкладчыкам, у тым ліку анлайн. Без якой-небудзь спецыяльнай падрыхтоўкі можна працаваць спецыялістам кол-цэнтра або дыспетчарам, няняй, хатнім работнікам, прыбіральшчыкам, вартаўніком, памочнікам па гаспадарцы.

«Важную ролю ў пошуку работы адыгрывае зразумелае і інфарматыўнае рэзюмэ. Ідэальны варыянт — кароткая выкласці свой функцыянал, падкрэсліць важныя для цікавай вакансіі моманты. І ў гэтым будуць карысныя адпаведныя сайты: проста запаўняйце своеасаблівую анкету-рэзюмэ, — тлумачыць кансультант. — Таксама варта памятаць, што сярэдні ўзрост рэкрутараў, якія праводзяць першасны адбор, — 23—30 гадоў. Улічвайце розніцу ва ўзросце і ўспрыманні інфармацыі, аптымізуйце сваё рэзюмэ і суправаджальны ліст так, каб у іх можна было лёгка знайсці патрэбную інфармацыю».

Асноўная рабочая сіла старэе

Дарэчы, спецыялісты сэрвісу rabota.by прааналізавалі даныя Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі і ўбачылі, што за апошняе дзесяцігоддзе колькасць насельніцтва ва ўзросце 20—24 гадоў знізілася амаль удвая — на 41,5 %. Гэта азначае, што за персанал на стартавыя пазіцыі (якія звычайна прапануюць моладзі) паміж работадаўцамі ідзе найманейшая канкурэнцыя. Наступная ўзроставая катэгорыя — 25—29 гадоў — таксама перажывае спад, а гэта людзі з досведам, якіх кампаніі вельмі актыўна наймаюць. У 2021 годзе ў параўнанні з 2011-м колькасць гэтай катэгорыі скарацілася прыкладна на 27 %.

Для наймальнікаў гэта сігнал, што неабходна мяняць падыходы да найму персаналу, бо запаўняць вакансіі толькі з арыенцірам на моладзь больш не атрымаецца — сёння проста няма такой колькасці працаздольных людзей, як гэта было яшчэ 10 гадоў таму.

Відавочна, што чакаецца скарачэнне колькасці актыўнага працаздольнага насельніцтва, а значыць, старэнне асноўнай рабочай сілы. Таму рана ці позна кампаніям давядзецца падбіраць іншыя інструменты пры пошуку супрацоўнікаў: больш актыўна разглядаць соцыяльнікаў 45—50 гадоў і «старэйшых», адаптаваць патрабаванні ў вакансіях пад больш шырокую аўдыторыю, уводзіць сістэмы навучання і перанавучання.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Валодзін: працэс дэдаларызацыі запушчаны ва ўсім свеце, яго не спыніць

Амерыканскі долар цяпер страчвае свае пазіцыі ў краінах свету, працэс замяшчэння долара ў міжнацыянальных разліках ужо не спыніць. Аб гэтым заявіў спікер расійскай Дзярждумы Вячаслаў Валодзін, паведамляе ТАСС.

«Наколькі хутка — пытанне адкрытае, але відавочна, што працэс дэдаларызацыі ва ўсім свеце запушчаны і яго не спыніць», — напісаў Валодзін у сваім Telegram-канале.

Для аслаблення аўтарытэту долара ёсць шэраг прычын, адзначыў Валодзін. Так, амерыканская валюта не забяспечана рэальнымі таварамі і рэсурсамі. Долар не прывязаны да золата, друкарскі станок у ЗША працуе без спынення. Гэта правакуе імклівую інфляцыю ў ЗША і нарошчванне і без таго значнага дзярждоўгу краіны.

Вашынгтон выкарыстоўвае долар у якасці рычага ўплыву для дасягнення сваіх палітычных мэт. Так, амерыканская валюта стала інструментам санкцыйнай палітыкі, калі непажаданым дзяржавам забараняецца праводзіць доларавыя разлікі. Такі стан спраў не задавальняе многія краіны свету.

Аслабленне долара таксама звязана з геапалітычнымі зменамі, калі свет перастаў быць аднапалярным з лідзіруючай пазіцыяй ЗША. «У свеце існуе запыт на шматпалярнасць. Як вынік — на альтэрнатыву долару. Доказ таму — усё большыя ўзаемаразлікі ў нацыянальных валютах», — адзначыў Валодзін.

«Ведомости»: месячны экспарт расійскага газу ўпаў на 40 %

У чэрвені экспарт газу з Расіі склаў 633 мільярды расійскіх рублёў, нафты — 605 мільярдаў, металургічнай прадукцыі — 172 мільярды рублёў. Такая інфармацыя была прадстаўлена на семінары для рэгіёнаў у Міністэрстве фінансаў РФ Федэральнай падатковай службай, паведамляюць «Ведомости».

Газета піша, што экспарт газу скарацiўся месяц да месяца на 40 %, у той час як у маі продажы энергарэсурсу былі вышэйшыя за 1 трыльён расійскіх рублёў. За гэты перыяд пастаўкі сыравіны знізіліся на 10 %: з 670 мільярдаў рублёў у маі да 605 мільярдаў у чэрвені. Экспарт металургічнай прадукцыі скарацiўся прыкладна на 30 %: з 258 мільярдаў рублёў у маі да 172 мільярдаў у чэрвені.

У маі выручка экспарцёраў у доларавым выражэнні склала $16,2 мільярда, у чэрвені — $11,1 мільярда.

Раней выданне Foreign Policy сцвярджала, што ўжо гэтай зімой свет сутыкнецца з пагаршэннем і без таго цяжкага энергетычнага крызісу, які выкліканы заходнімі санкцыямі супраць Расіі.

Трамп страціць $103 мільёны, калі вылучыцца ў прэзідэнты

Як толькі экс-прэзідэнт ЗША Дональд Трамп абвесціць аб сваім удзеле ў перадвыбарнай гонцы, ён страціць доступ да $103 млн, якія ён кантралюе ў якасці кіраўніка камітэта палітычных дзеянняў «Выратаваць Амерыку». Аб гэтым піша агенцтва Bloomberg.

Абмежаванні на доступ да гэтай сумы дыктуюцца федэральным законам. Адзначаецца, што Трамп зможа ўзяць усяго толькі $5000 з гэтых сродкаў на патрэбы перадвыбарнай кампаніі. У той жа час вылучэнне экс-прэзідэнта, піша Bloomberg, магло б заахвоціць яго шматгадовых спонсараў «напоўніць казну яго перадвыбарнай кампаніі».

«Трамп паказаў, што можа хутка збіраць грошы: праз тры тыдні пасля паражэння на выбарах 2020 года ён далучыўся да Нацыянальнага камітэта Рэспубліканскай партыі, каб сабраць $207,5 млн долараў, іржыва заявіўшы, што масавыя махлярствы прывялі да яго паражэння», — пішуць аўтары матэрыялу.

Аглядальнік The New York Times Чарльз Блоў раней заявіў, што палітычная сістэма ЗША і само існаванне краіны акажуцца пад пагрозай, калі былы амерыканскі прэзідэнт Дональд Трамп не паўстане перад судом за падзеі вакол штурму Капітолія ў студзені 2021 года.

Весткі з месцаў

...КАЛІ ХОЧАЦЕ АДПАЧЫЦЬ, ВАМ НА ЮШКУ Ў СОМІНА,

дзе штолета ладзіцца адмысловы фестываль

З кожным годам ён набывае ўсё большы размах, бо людзі тут асаблівыя. Многія для росквіту сваёй вёскі не пашкадуюць апошняй кашулі. Яны тут і арганізатары, і спонсары, і рабочая сіла... «Гадоў праз пяць Сомінскі фэст будзе грымець, як «Славянскі базар», — заявіў адзін з месцічаў. Я спачатку хіба ўсміхнулася, аднак...

Сцэну перамясцілі бліжэй да возера, каб гледачам было ўтульней. На фоне прыгожага банера з назвай мерапрыемства госці з задавальненнем рабілі сэлфі, як і на лавачцы каля фігуркі сома, зробленай спецыяльна для фестывалю.

Падчас яго, ну вядома ж, працаваў выязны гандаль: пад шашлычкі можна было пасядзець кампаніяй, пагаманіць, купіць сувеніры ў народных майстроў, падзівіцца на творы юных мастакоў, адвесці душу ў танцах на дыскатэцы каля возера, палюбавацца шыкоўным феерверкам...

А для таго каб на свяце вёскі стаць пераможцам у конкурсе на найлепшую юшку, трэба было не толькі налавіць рыбы і зварыць яе — самую смачную, але і крэатыўна прадставіць сваю каманду, арганізаваць падворак, пачаставаць гасцей, абараніць свой рэцэпт перад журы, паўдзельнічаць у спартыўных конкурсах, выступіць з нумарам мастацкай самадзейнасці...

Трэба сказаць, што ўсе каманды стараліся: там юшка — «Сомінская», тут — «Савецкая», там «Буржуйская», «Каралеўская»... Падворкі таксама афармляліся на розны густ: з вышытымі ручнікамі і граматамі за папярэднія гады, з поварскімі каўпакамі, з букетамі і нават з падрабязнай картай навакольных балот і ўрочышчаў. Пераможцай фестывалю «Сомінская юшка — 2022» стала каманда «Ні хваста, ні лускі», другое месца — «Уха-ха» — новае пакаленне», трэцяе — у каманды «Юшка маладзёжная».

Апроч іх на фэсце ў Соміне можна было патанцаваць пад віртуозную ігру артыста абласной філармоніі Андрэя Федзяя, узяць аўтограф і сфатаграфавацца з заслужаным артыстам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Саладухам, які выступіў тут з канцэртам, паслухаць мужчынскі хор Пінскай епархіі і народныя песні ў выкананні бацюшкаў (на тое, каб парадаваць вяскоўцаў, іх блаславіў епіскап Пінскі і Лунінецкі Георгій), а таксама ансамбля «Ліра» Гортальскага СДК...

Упершыню на такім высокім узроўні была і спартыўная праграма: выступаў неаднаразовы чэмпіён свету па гіравым спорце Ігар Сігневіч з чэмпіёнамі-сябрамі. Гіры па 32 кілаграмы (!) яны падкідвалі ўверх, як мячыкі, а 40-кілаграмовую Ігар падымаў... адным пальцам.

Любы з ахвотных мог пабароцца на руку з чэмпіёнам Еўропы па армрэслінгу Віктарам Братчэнем, натоўпы гледачоў сачылі за перацягваннем каната і гульнёй у гарадкі з хромавым ботам.

Моладзь гуляла ў валейбол, каталася на лодках, на матацыклах байкераў, гуляла ў шахматы са спецыялістамі райаддзела МНС, пост якіх дзяжурыў на свяце.

...Сёння шмат каго просяць назваць пяць прычын, каб наведаць нейкае цікавае месца. Я з лёгкасцю магу назваць дзясятак, чаму трэба завітаць у Соміна. Ну, па-першае, там чыстае возера, у якім водзяцца не толькі самы, па-другое, лясы, шчодрыя на грыбы і ягады, па-трэцяе, непаўторныя аграсядзібы, краявіды, гасцінныя, багатыя на таленты людзі... Так што калі хочаце адпачыць, вам у Соміна.

Кіраўніцтва Целяханскага сельвыканкама выказвае асаблівую ўдзячнасць спонсарам свята Валянціну Абрамчуку, Аляксандру Абрамчуку, Сяргею Капыцічу, Мікалаю Капыцічу, Андрэю Куцко, Мікалаю Малінчыку, шчыра дзякуе Аляксандру Якімовічу, Дзмітрыю Куцко, Таццяне Куцко, Віктару Дзягцярыку, Іне Герштовай за актыўную арганізацыю і правядзенне свята, усім жыхарам вёскі.

...Калі хочаце зразумець, з чаго пачынаецца патрыятызм, — вам зноў у Соміна.

Валянціна БОБРЫК.
Фота Валерыя МІСКЕВІЧА.

У паход... Па новыя ўражанні

Сем'і, у якіх выхоўваюцца дзеці з інваліднасцю, наведалі аграсядзібу «Вялес»

Яе ўладальнік Алег Анатолевіч Мізула арганізаваў адмысловы водны «паход» па рацэ Вілія, расказаў пра даследаванні графа Канстанціна Тышкевіча, паказаў дубы, якім па трыста гадоў, неверагодны вадаспад, Тупальшчынскі валун, расказаў старадаўнюю легенду пра камяні, якія патрэбныя былі езуітам для ўзвядзення касцёла ў Жодзішках, і чарцей, што хацелі перашкодзіць будаўніцтву храма... Госці слухалі ўсё, стаіўшы дыханне... Як і дзіўныя песні самога Алега Анатолевіча.

Для дзяцей, а таксама для іх бацькоў тут была цудоўная магчымасць поўнасцю змяніць абстаноўку, атрымаць яркія ўражанні і новыя веды.

Усё гэта стала магчымым дзякуючы фінансавай падтрымцы Беларускага дзіцячага фонду.

Ларыса ТАТАРЫНАВА,
г. Смаргонь.

Свой погляд

ЦІ ПАВІННЫ ЗНІКАЦЬ КРЫЖЫ?

...Чыйсьці аб'ёмны турыстычны заплечнік, рассякаючы хмару камароў, нязграбна ляціць на процілеглы бераг канавы. Следам за ім кіруемся і мы: пераходзім, пералазім, крочым трохі далей — і...

Вось ён, забыты помнік: злева, каля амаль зарослай лясной дарогі, узвышаецца металічны крыж з надпісам: *«ПАМЯТЬ по ОТЦУ и всем погибшим здесь в 1943 г. От дочери, внуков и правнуков».*

Вакол помніка чорная з жоўтым абгародка, унутры — вельмі стары вянок, трохі пабітая талерка ды чарка. Ніякіх імёнаў, ніякіх канкрэтных дат.

...Пошук інфармацыі амаль нічога не даў. Хіба на сайце Дарагануўскага краязнаўчага музея знайшлося кароткае: «Членамі атрада быў зроблены запіс успамінаў жыхаркі в. Радуцічы Багдановіч А. С. (дзявочае прозвішча Дрындзік, у гады вайны жыла ў в. Лука), пра лясную магілу каля Дрындзікавай канавы. Там стаіць крыж і агароджа, даглядае магілу жанчына, якая лічыць, што там пахаваны яе бацька і цётка, якіх расстралялі партызаны за сувязь з немцамі. На самай справе там ляжаць 11 чырвонаармейцаў-прыпіснікоў з в. Лука, расстраляных па даносе старасты, які паехаў у г. Старыя Дарогі і выдаў іх. Дзе пахаваны сваякі жанчыны — невядома, але яна даглядае гэту магілу, і людзі ёй не пярэчаць».

Звестак пра лёсы ні гэтай жанчыны, ні чырвонаармейцаў-прыпіснікоў знайсці не ўдалося. Хіба зварот у Магілёўскі абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Віккру» дапамог высветліць, што гады тры таму ля крыжа нехта быў, пакінуў цукеркі. Месца прыбіралі «віккраўцы».

І тым не менш, падыходзячы да помніка сёлета на пачатку мая, мы ўсё роўна спадзяваліся ўбачыць нейкія змены...

Мы памыліліся: вянок і чарка з талеркай стаялі на ранейшых месцах, новых кветак не з'явілася. Не з'явіліся яны і на Дзень Перамогі. Мы самі вырашылі навесці на магіле парадак, пакінуць кветкі і свае каардынаты.

Падчас работы знайшлі там маленечкую рамку для фотаздымка. Хто пакінуў яе? З чыім партрэтам? Пытанняў куды больш, чым адказаў.

...Далей дарога па-ранейшаму вяла ў лес. Час ад часу ледзь не з-пад ног узляталі качкі, разбягаліся ў гушчар казулі.

Воінскае пахаванне № 7488 убачылі яшчэ здалёк: там вялізны манумент. Могілкі на месцы знішчанай у час вайны вёскі Масты Глускага раёна аказаліся зусім маленькімі. Звычка ўважліва глядзець пад ногі не дазволіла прайсці міма крыжа, які схаваўся пад галінамі маладога дуба. Сасновая шышка, звалiўшыся зверху, «прабіла» гнілую драўніну і засталася ў ёй вялікай стрэмкай. Светлая зорка на цвіку самотна глядзела ў неба... Адсюль да дагледжанага воінскага пахавання — метраў дзесяць, не больш! Метраў дзесяць паміж памяццю і забыццём.

Па законе чужы чалавек можа прыбраць на магіле хіба лісце ды смецце. Нешта зносіць ды мяняць — нельга. Колькі ж праіснуе гэты крыж, калі ён ужо цяпер прабіты шышкай?! Што чакае гэтае месца, калі тых, хто ведаў пра яго і мог клапаціцца, не засталося?

Кожны Дзень Перамогі мы наведваем помнікі. Да асобных манументаў (асабліва ў вялікіх гарадах) прыносім сотні букетаў. І пры гэтым дазваляем знікаць крыжам.

...Мэта нашага пошукава-этнаграфічнага праекта «УсПомні» — захаванне забытых гісторый — звестак аб такіх вось, амаль зніклых, месцах Памяці. І таму мы будзем вельмі ўдзячныя за любую інфармацыю пра гэтыя крыжы.

А яшчэ вельмі хацелася б (бо трэба!), каб у людзей з'явілася права гнілы крыж памяняць на гэткі ж новы. Ставіць сучасныя помнікі — ідэя наўрад ці добрая: як на мой погляд, дык пахаванні ваенных часоў нашчадкі павінны ўбачыць такімі, якімі яны былі: з крыжамі, са сціплымі абеліскамі з гравіроўкай, бо ўсё гэта — наша гісторыя, і ўсё — спадчына.

Мы ўпэўненыя, што кожны абаронца нашай зямлі варты павагі і ўвагі. Мы, нашчадкі — пакаленне за пакаленнем — павінны захоўваць памяць. Наша мэта — успомніць, вярнуць з небыцця імёны тых, хто згубіўся.

Ірына БАБРОЎСКАЯ,
настаўніца і аўтар пошукава-этнаграфічнага праекта «УсПомні». Нашы кантакты: сайт: http://вспомни.бел/; электронная пошта: pr-vspomni@yandex.by

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Цікава ведаць

ДЫХАЙЦЕ ГЛЫБЕЙ

Чым пахнуць каханне, трывога і радасць?

Свой пах ёсць у вясны, у дзяцінства і ў старасці. Можа «пахнуць смажаным», і мы не толькі разумеем метафару, але і адчуваем гэты няўлоўны пах трывогі. З кожным здараласа нешта падобнае: раптоўны пах карыцы і мандарына пераносіць нас у калядную атмасферу адыходзячага года, а пах вядомых духоў мінулых гадоў нагадвае аб юнацтве. Пры гэтым з дапамогай нюху мы атрымліваем усяго 2 % інфармацыі, у той час як пры дапамозе зроку — 85 %. Аднак з пяці пачуццяў чалавека нюх — самае хуткае і выразнае. Аб ролі пахаў гаворым з псіхолагам Мінскага гарадскога клінічнага цэнтра псіхіятрыі і псіхатэрапіі Таццянай БАНДАРЭНКАЙ.

— Таццяна Міхайлаўна, нашу памяць на пахі па-іншаму называюць «эфект Пруста». Чым гэта тлумачыцца?

— Аднойчы ў зімовы дзень французскі пісьменнік Марсэль Пруст прыйшоў дадому, і цётка наліла яму кубак ліпавай гарбаты і паставіла сподак з печывам.

«...у тое самае імгненне, калі глыток гарбаты з дробкамі печыва дакрануўся да майго паднябення, я здрыгануўся, уражаны незвычайнасцю таго, што адбываецца ўва мне...» Гэтых уражанняў, якія востра адчуваў Пруст, хапіла, каб напісаць цэлую кнігу на тры тысячы старонак — «У пошуках страчанага часу». У навукова-папулярных публікацыях з'ява ярка афарбаваных эмацыянальных успамінаў, выкліканых вызначаным пахам, смакам ці іх спалучэннем, атрымала назву «Эфект Пруста».

— Чаму мы так рэагуем на пахі?

— Нюх — самая старажытная зона мозга. З яго дапамогай чалавек атрымлівае не больш за 2 % інфармацыі аб навакольным асяроддзі, а з дапамогай зроку — 85 %. Аднак з пяці пачуццяў чалавека нюх — самае хуткае і выразнае.

Напрыклад, нюхальны імпульс даходзіць да мозга нашмат хутчэй, чым болевы. Гэта адбываецца імгненна, на падсвядомым узроўні. Нерв, які адказвае за перадачу нюхальных сігналаў, злучаны з мозгам наўпрост. Нос — адзіны орган пачуццяў чалавека, які не мае пасрэднікаў!

Калі чалавек удыхае пах, у мозг дасылаецца пэўны сігнал, які потым распаўсюджваецца па ўсім арганізме. Усе гэтыя структуры або ўчасткі галаўнога мозга разам утвараюць лімбічную сістэму, якая адыгрывае важную ролю ў кіраванні нашым настроем, паводзінамі, эмоцыямі, частатой сардэчных скарачэнняў, крывяным ціскам, дыханнем, памяццю, стрэсам і гарманальным балансам.

Навукоўцы, якія даследавалі ўздзеянне пахаў на чалавека, пішуць, што пахі ўплываюць на эмоцыі, апошнія, у сваю чаргу, — на паводзіны, гэта значыць ад уздзеяння пахаў узнікае ланцуг наступстваў! Атрымліваецца, пах іграе такую вялікую ролю ў памяці, настроі і эмоцыях. Пахі — гэта адначасова і пра біялогію, і пра асабісты досвед кожнага. З даўніх часоў усходнія народы выкарыстоўваюць пахі для павышэння тонусу.

— Ці праўда, што ў кожнага свой пах і па ім мы выбіраем нават каханага чалавека?

— Сучасныя людзі вельмі часта карыстаюцца парфумай, і пачуць іх натуральны пах складана. Аднак у Афрыцы да гэтага часу існуе племя, дзе жонку і мужа выбіраюць толькі па паху. Разводаў не бывае.

Сапраўды, пах чалавечага цела індывідуальны. Колькі ў свеце людзей, столькі і розных непаўторных пахаў. Дзякуючы гэтаму жывёліны знаходзяць след гаспадара. А маленькія дзеці пазнаюць маму па паху рэчаў.

Вядома, што кожны наш эмацыянальны стан выклікае адмысловую хімічную рэакцыю ў арганізме, і гэта ўплывае на пах поту. Пот ад работы і пот ад сексу па хімічным складзе крыху розныя. Пот чалавека, які бяжыць на дапамогу, адрозніваецца ад поту злачынцы, які ўцякае.

— Ці можа пах аказваць лячэбны эфект?

— Да 1880 года існавала толькі 160 натуральных водараў — кветак, травы, садавіны. Цяпер жа сінтэзуюць водары чаго заўгодна — ад нервовага зрыву да шчасця на Сейшэлах.

Зыходзячы з таго, што лімбічная (яна ж эмацыянальная) сістэма непасрэдна звязана з тымі часткамі мозга, якія кантралююць

частату сардэчных скарачэнняў, артэрыяльны ціск, дыханне, памяць, узровень стрэсу і гарманальны баланс, даследчыкі лічаць, што пахі могуць мець тэрапеўтычны ўплыў на фізіялагічны і псіхалагічны стан чалавека. У 1980-х гадах атрымаў развіццё такі кірунак, як аромакалогія, гэта значыць вывучэнне таго, як пахі ўплываюць на фізіялогію, здароўе чалавека, а цяпер набіраюць абароты такія напрамкі, як ароматэрапія, аромадыягностыка і нават аромапсіхалогія.

ВОДАРЫ, КАРЫСНЫЯ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ

— Пах *эўкаліпта* дапамагае засяродзіцца, сабрацца з думкамі.

— Пах *аеру* супакойвае, павялічвае апетыт і выклікае агіду да курэння.

— Пах *пачуляў* прыбірае трывогу, дапамагае змагацца з дэпрэсіўным станам, стымулюе фантазію.

— Пах *апельсіна* паляпшае настрой, здымае стомленасць, пазбаўляе ад змрочных думак.

— Пах *ружы* павышае працаздольнасць, здымае ператамленне і дапамагае змагацца са стрэсам.

— Пах *язміну* пазбаўляе ад апатыі, стымулюе арганізм.

— Пах *лаванды* — антыдэпрэсант. Дапамагае змагацца са стрэсам і дэпрэсіўным станам.

— Пах *ванілі* дапамагае пры лячэнні нервовых зрываў.

Так, шматлікія рэчы выклікаюць у нас эмоцыі, прыемныя і не вельмі: пах бабулінай хаты, пах новых скураных пальчатак, новага аўтамабіля, водар квітнеючай ліпы, жухлай лістоты, стаматалагічнага кабінета, пах валасоў каханага чалавека...

І ўплывам пахаў на нашу падсвядомасць актыўна карыстаюцца. У прыватнасці, каб прыцягнуць да свайго брэнда, маркетолагі распыляюць адпаведныя водары на новенькія гаджэты, абутак, адзенне, спадзеючыся, што пакупнікі будуць вяртацца зноў і зноў. Бо за кожнай пакупкай стаіць свой пах, які будзе заўсёды нагадваць пра яе. А як жа хочацца вярнуцца ў краму па адмысловыя адчуванні ад новай пакупкі. І гэта працуе!

У офісах Японіі па вентыляцыйнай сістэме распыляюць розныя пахі для лепшай працаздольнасці работнікаў, нават каля кабінетаў стаматолагаў іх выкарыстоўваюць для заспакаення і расслаблення пацыентаў.

З нагоды

ЗАРАЗІЦЦА ГЕПАТЫТАМ МОЖНА ДЗЕ ЗАЎГОДНА

А вось вылечыцца часам немагчыма

Паводле статыстыкі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у свеце каля 325 мільёнаў чалавек інфіцыраваны вірусамі гепатытаў В і С і каля 1,5 мільёна чалавек штогод памірае ад з'яў, з гэтым звязаных. Смяротнасць ад гепатытаў знаходзіцца на другім месцы пасля смяротнасці ад туберкулёзу, а колькасць пацыентаў, інфіцыраваных гепатытамі, у 9 разоў перавышае колькасць людзей, якія жывуць з ВІЧ. Заўтра адзначаецца Сусветны дзень барацьбы з гепатытам. Чым небяспечныя гэтыя інфекцыі і чаму ад моманту заражэння да першых сімптомаў часта праходзіць 10-15 гадоў, расказаў загадчык аддзела прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі і парэнтэральных вірусных гепатытаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Аляксандр АТАМАНЧУК.

Вірусны гепатыт — гэта запаленчае пашкоджанне печані, якое выклікае цяжкія захворванні і можа прывадзіць да раку печані. Існуе пяць асноўных відаў вірусных гепатытаў — A, B, C, D і E. Людзі заражаюцца вірусным гепатытам ад інфіцыраваных асоб ці ад заражаных харчовых прадуктаў і вады. Гепатыты A і E перадаюцца праз заражаную ваду ці харчовыя прадукты і звязаныя з неналежнай санітарыяй і дрэннай асабістай гігіенай. А вось вірусныя гепатыты B, C і D перадаюцца праз кроў інфіцыраванага чалавека — пры небяспечных ін'екцыях ці маніпуляцыях, падчас якіх парушаецца цэласнасць скурнага покрыва і слізістых. Адметна, што ў выпадку з вірусным гепатытам B і C заражэнне можа адбывацца пры незасцярожаных сексуальных кантактах. Вірусны гепатыт D паражае толькі таго, хто ўжо мае гепатыт тыпу B.

— Магчымае заражэнне і некалькімі тыпамі вірусаў адразу. У медыцынскай практыцы гэта называецца мікст-гепатытам. І ў нас ёсць такія пацыенты. Ход мікст-формы гепатытаў больш небяспечны, бо аказвае большую нагрузку на арганізм. Калі вірусны гепатыт C можна цалкам вылечыць, то ў дачыненні віруснага гепатыту B такой магчымасці пакуль няма. Пацыенты з вірусным гепатытам B, вядома, атрымліваюць лячэнне, але вылечыцца немагчыма, — тлумачыць Аляксандр Атаманчук.

Менавіта гепатыт B і C у медыцынскім асяроддзі сёння выклікае асаблівы непакой, бо большасць інфіцыраваных можа не адчуваць ніякіх сімптомаў на ранніх стадыях, і даведваецца аб хваробе толькі тады, калі наступае хранічная форма.

— Часам ад моманту інфіцыравання да хранічнай формы і праяўлення сімптомаў, якія непакояць, праходзіць ад 10 да 15 гадоў. Акрамя таго, вірусны гепатыт B і C з'яўляецца асноўнай прычынай цырозу і раку печані і выклікаюць амаль 80 % смерцяў, звязаных з вірусным гепатытамі. Па даных СААЗ каля 90 % інфіцыраваных гепатытам не ведае, што ў іх ёсць гэта хвароба, — расказвае спецыяліст.

У маі 2016 года ўсе краіны-ўдзельніцы СААЗ прынялі план дзеянняў па поўнай ліквідацыі гепатытаў B і C да 2030 года. У Беларусі для зніжэння захваральнасці, распаўсюджанасці і смяротнасці ад віруснага гепатыту C і яго ўскладненняў прыняты план па элімінацыі віруснага гепатыту C да 2028 года. Ён прадугледжвае пашырэнне тэсціравання насельніцтва і праграм лячэння. Таксама план уключае забеспячэнне лекавымі прэпаратамі пацыентаў.

— За 2020 і 2021 гады ў краіне прайшло лячэнне каля 12 тысяч чалавек. На сёння прымяняюцца дастаткова сучасныя прэпараты, эфектыўнасць лячэння дасягае больш чым 90 %, — прывёў лічбы Аляксандр Атаманчук.

Сёння прайсці абследаванне на гепатыт у Беларусі можна бясплатна. Для гэтага трэба звярнуцца ў арганізацыю аховы здароўя па месцы жахарства. Урач агульнай практыкі ці інфекцыяніст выпішуць накіраванне на аналізы. Таксама праводзяцца акцыі па тэсціраванні насельніцтва на гепатыты B і C. Напрыклад, да 12 жніўня ў Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя праходзіць акцыя па экспрэс-тэсціраванні. Можна абследавацца бясплатна і ананімна.

Што датычыцца прафілактыкі віруснага гепатыту B, то тут адзіны спосаб — вакцынацыя. Прышчэпка засцерагае вас на ўсё жыццё.

— У свеце вылікае колькасць людзей прышчапляецца штогод. Праяўленне непажаданых рэакцый магчымае, але як правіла, яны нямоцныя і кароткачасовыя. Таму вакцынацыя — адзіны спосаб засцерагчы сябе і сваё дзіця ад з'яўлення захворвання і ад яго наступстваў, — звяртае ўвагу спецыяліст. — У першую чаргу рэкамендую вакцынаваць дзяцей, і калі чалавек сам не прышчэплены, ён можа схадзіць да ўрача агульнай практыкі ці ўрача-інфекцыяніста і прайсці вакцынацыю.

А вось вакцыны ад гепатыту C у свеце пакуль няма. Аднак ёсць эфектыўнае лячэнне, якое дазваляе цалкам вылечыць хваробу. Пры гэтым, паколькі розныя формы атрымання вакцын цяпер актыўна развіваюцца, з'яўляюцца РНК-вакцыны, цалкам імаверна, што ў хуткім часе з'явіцца і засцярога ад гепатыту C.

Пакуль жа ў якасці прафілактыкі медыкі раяць падчас сексуальных кантактаў выкарыстоўваць прэзерватыў, бо вірусныя гепатыты B і C могуць перадавацца палавым шляхам. Таксама варта памятаць, што кожная ін'екцыя мусіць быць бяспечнай. Адначасова варта з асцярожнасцю ставіцца да ўсіх маніпуляцый, падчас якіх парушаецца цэласнасць скурнага покрыву і слізістых — татуіровак, манікюру, перманентнага макіяжу, асабліва калі такія маніпуляцыі выконваюцца ў непрыстасаваных умовах, дзе не выконваюцца прынцыпы стэрыльнасці і дэзынфекцыі. Таксама пажадана выкарыстоўваць толькі асабістыя прадметы гігіены — прылады для галення, зубныя шчоткі, ручнікі.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
27 ліпеня 2022 г. № 28 (664)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

«ВЕДАЮ, ШТО МНЕ ДАПАМОГУЦЬ»

З чым людзі прыходзяць на асабісты прыём да Наталлі Качанавай

Работа з насельніцтвам з'яўляецца прыярытэтным напрамкам у дзейнасці Савета Рэспублікі — яна вядзецца бесперапынна, нягледзячы на міжсезонны перыяд. Грамадзян, якія запісаліся 20 ліпеня на асабісты прыём да Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ, цікавілі пытанні самага рознага кшталту. Разглядаліся сітуацыі, звязаныя з якасцю жыцця людзей: жыллёва-камунальная гаспадарка, транспартная сувязь, уладкаванне дзяцей у садкі і школы, а таксама працоўная дзейнасць.

Фота БелТА.



— Калі звярталася да чыноўнікаў, якія займаюць невысокія пасады, я хвалявалася. Але сёння ў Савеце Рэспублікі такіх пачуццяў ужо не было. Калі я запісвалася на прыём, са мной настолькі ветліва і добразычліва размаўлялі, што ўсякае хваляванне адступіла. Гутарка з Наталляй Качанавай ішла лёгка, я вельмі добра адчуваю сябе пасля сустрэчы. Цяпер ведаю, што ўсё атрымаецца і мне дапамогуць, — падзялілася ўражаннямі Алена Чырун. Яе зварот быў таксама разгледжаны падчас асабістага прыёму грамадзян.

Для некаторых з удзельнікаў сустрэча стала апошняй надзеяй — пытанні, з якімі людзі звярнуліся да Наталлі Качанавай, не вырашаліся гадамі. Напрыклад, як і сітуацыя Алены Чырун. Жанчына спрабуе вырашыць праблему з 2018 года, звяртаючыся ў розныя інстанцыі. На адным з этапаў яна пайшла ў суд, які разгледзеў справу і пастанавіў, што права на яе баку. Але і гэта не дало ніякага выніку — сітуацыя не рухаецца з месца. А справа вось у чым: маці жанчыны атрымала дазвол на будаўніцтва гаспадарчай пабудовы на ўласным участку. Будоўля вялася без адхіленняў ад узгодненага плана, але ў 2019 годзе Фаніпальскі сельвыканкам адмовіўся ўводзіць будынак у эксплуатацыю. Праз год маці Алены памерла, жанчына стала законнай спадчынніцай зямельнага ўчастка. Грамадзянка бесперапынна звярталася ў сельвыканкам, Мінскі аблвыканкам і Дзяржынскі райвыканкам, але ўводу будынка ў эксплуатацыю так і не дабілася. Адразу падчас прыёму ад Наталлі Качанавай паступіў загад: тэлефанаваць старшыням сельвыканкама і райвыканкама і выклікаць іх у Савет Рэспублікі, каб атрымаць адказ, чаму да гэтага часу будынак не ўводзяць у эксплуатацыю.

Падчас асабістага прыёму Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на тое, што на сустрэчу трэба запрашаць не толькі «пацярпелых», але і адказных. Па-першае, каб сітуацыя вырашалася як мага хутчэй, а па-другое, каб чуць, чаму пытанне не вырашаецца на працягу некалькі гадоў.

Некаторыя з праблем, з якімі грамадзяне звярталіся да Наталлі Качанавай, былі сапраўды траўматычнымі для пацярпелых. Так, жанчына з інваліднасцю распаўляла Старшыні Савета Рэспублікі аб канфлікце ў адной са сталічных устаноў. На жаль, яе маці, якая і стала галоўнай пакрыўджанай, памерла. Жанчыне перашкаджалі ў арганізацыі мерапрыемстваў, нягледзячы на тое, што яны праходзілі з вялікім поспехам. Таксама кіраўніцтва адмаўляла ёй у водпуску, не звяртаючы ўвагу на тое, што згодна з Працоўным кодэксам, просьба была правамернай. Калі грамадзянка ўсё ж такі сышла ў адпачынак, а праз пэўны тэрмін вярнулася на работу, то заўважыла, што доступ да яе рабочай электронай пошты забаронены, а ўсе напрацоўкі на камп'ютары за 13-гадовы тэрмін знішчаны. Пры гэтым яе заяву аб добраахвотным звальненні не падпісвалі. Дачка пацярпелай адзначыла, што на той момант яе маці была ўжо пенсіённага ўзросту і вельмі цяжка перажывала канфлікты такога кшталту. Па словах грамадзянкі, у дадзеным канфлікце прысутнічае не толькі асабістая непрыязнасць кіраўніка, але і карупцыйны складнік. Наталля Качанава паабяцала, што справа абавязкова будзе перададзена ў праваахоўныя органы.

Ячшэ адна сітуацыя, якую разгледзела Старшыня Савета Рэспублікі, была звязана з нядобрасумленнай работай ЖЭСа. Грамадзянка звярнулася з просьбай вырашыць пытанне па рамонце даху. Яна распавяла, што дах у яе кватэры працякае з 2019 года — жанчына звярталася не толькі ў ЖЭС, але ў ЖРЭУ і адміністрацыю раёна. Праблемы з дахам з'явіліся яшчэ раней, але рамонт, які быў праведзены супрацоўнікамі ЖЭСа, аказаўся няякасным. На сустрэчы прысутнічаў намеснік кіраўніка адміністрацыі Партызанскага раёна сталіцы Вадзім Лебедзь, які запэўніў пацярпелую, што рамонт абавязкова пераробяць у самым хуткім часе. Але Наталля Качанава ўсё ж такі звярнулася да намесніка кіраўніка адміністрацыі з пытаннем, што перашкаджала вырашыць праблему раней, да прыёму ў Савеце Рэспублікі:

— А калі б я прымала грамадзян у 2025 годзе, вы таксама цягнулі б з вырашэннем сітуацыі? — спытала яна ў чыноўніка.

Падчас асабістага прыёму былі разгледжаны іншыя пытанні, сярод якіх арганізацыя бесперапынных паставак вырабаў медыцынскага прызначэння і медыцынскай тэхнікі, выдзяленне зямлі для выпасу жывёлы, магчымасць атрымання лекаў для дзіцяці, а таксама сацыяльная падтрымка для дзяцей-сірот і паляпшэнне іх жыллёвых умоў.

Арына КАРПОВІЧ.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Ролю грамадскіх арганізацый недаацэньваць нельга

Расказваем самыя цікавыя навіны мінулага тыдня

● Пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай адбыўся ўстаноўчы сход пярвічнай арганізацыі РГА «Белая Русь» Савета Рэспублікі. «Стварэнне пярвічнай арганізацыі «Белай Русі» ў Савеце Рэспублікі — важная падзея. Сёння ролю грамадскіх арганізацый недаацэньваць нельга. Гэта аб'яднанні людзей, якія імкнуцца рабіць сваю краіну лепшай, больш камфортнай для пражывання», — падкрэсліла Наталля Качанава. Спікер расказала, што ў Савеце Рэспублікі вядзецца работа над законапраектам аб грамадзянскай супольнасці, дзе грамадскія арганізацыі будуць дакладна вызначаны апорай палітыкі, якая праводзіцца ў краіне. Яна выказала ўпэўненасць, што работа, якая будзе праводзіцца грамадскай арганізацыяй «Белая Русь», дасць свае вынікі і будзе накіравана на рэалізацыю задач, што стаяць перад грамадствам. Старшыня РГА «Белая Русь», член Савета Рэспублікі Алег Раманаў запэўніў, што грамадская арганізацыя будзе працягваць курс падтрымкі палітыкі кіраўніка дзяржавы. Падчас пасяджэння старшынёй пярвічнай арганізацыі РГА «Белая Русь» Савета Рэспублікі абрана начальнік інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Кацярына Рэчыц.

● Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец узяла ўдзел у пашыраным пасяджэнні Праўлення Нацыянальнага банка. Удзельнікі пасяджэння падвялі вынікі работы рэгулятара па забеспячэнні макраэканамічнай стабільнасці ў першым паўгоддзі 2022 года, абмеркавалі пытанні фарміравання празрыстага і камфортнага бізнес-асяроддзя, павышэння сацыяльных стандартаў і ўзроўню абароны насельніцтва ў фінансавай сферы.

«У Савет Рэспублікі паступае дастаткова шмат зваротаў грамадзян, якія датычацца абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг. Значыць, адпаведныя змяненні ў заканадаўства наспелі. Трэба паставіць надзейную прававую заслону недобрасумленным крэдыторам, перш за ўсё мікрафінансавым арганізацыям, якія часта навязваюць залішнія паслугі грамадзянам і спаганяюць за гэта асобную плату, павялічваючы агульную крэдытную нагрузку на спажыўцоў», — адзначыла Таццяна Рунец. Па яе ініцыятыве ў рамках пасяджэння разгледжаны ход рэалізацыі саюзных праграм у грашова-крэдытнай і валютнай сферах, запланаваныя меры па зніжэнні сярэдніх ставак па крэдытах, антыінфляцыйная палітыка ў новых умовах. «Ступень удзелу грашова-крэдытнай палітыкі ў стымуляванні эканамічнага росту — пытанне дыскусійнае. Але сярэднія стаўкі на новых крэдытах на ўзроўні 19 працэнтаў пры сярэдняй рэнтабельнасці па краіне ў 10 працэнтаў не садзейнічаюць развіццю эканомікі. Вядома, гэтую праблему трэба вырашаць комплексна, забяспечваючы агульную раўнавагу на рынку пазыковага капіталу. Але для ўстойлівага развіцця грошы на эфектыўныя інвестыцыйныя праекты па прымальнай стаўцы павінны быць. Гэта базавая функцыя банкаўскай сістэмы», — падкрэсліла сенатар.

● Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктар РНПЦ дзіцячай хірургіі Канстанцін Драздоўскі прыняў дэлегацыю дзіцячых кардыяхірургаў кардыяцэнтра з Самарканда. Асноўная мэта візіту ўзбекскіх хірургаў — атрыманне вопыту ў кардыяхірургіі нованароджаных. У рамках візіту былі абмеркаваны пытанні далейшага супрацоўніцтва, правядзення сумесных навуковых даследаванняў і публікацый у галіне дзіцячай хірургіі, а таксама працягу практыкі правядзення майстар-класаў для ўзбекскіх дзіцячых кардыяхірургаў.

Валерыя СЦЯЦКО.

ШАНЦ ДЛЯ ВЁСКІ

Карэспандэнт «МС» высвятляла, наколькі прасцей будзе на месцах вырашаць зямельныя пытанні

Новы Кодэкс аб зямлі чакалі. Асабліва на перыферыі. Менавіта тут часцей за ўсё ўзнікалі пытанні, пачынаючы ад рэгістрацыі ўчасткаў, заканчваючы спрэчкамі вакол стыхійных пабудоў і перадачы зямлі ў спадчыну. Закон распрацоўваўся не адзін год, дасканала вывучаўся на месцах. Сёлета ён быў прыняты ў першым чытанні, але перад тым, каб паставіць кропку, распрацоўшыкі на чале са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам Андрэйчанкам прыехалі ў Бялынічы і яшчэ раз з кіраўнікамі выканаўчай і прадстаўнічай улады, пачынаючы ад базавага звяна, шліфавалі нормы. Бо большасць зямельных пытанняў па новым заканадаўстве будзе вырашацца на месцах.

І вось новая рэдакцыя Кодэкса аб зямлі прынятая абедзвюма палатамі парламента і падпісана Прэзідэнтам. Мы пацікавіліся ў прадстаўнікоў мясцовай улады, наколькі важныя прынятыя ў зямельным заканадаўстве змяненні ў іх рабоце.

Парадку стане больш

Старшыня Яноўскага сельсавета, што на Краснапольшчыне, Наталля ЛАГУЦІНА прыгадала найбольш распаўсюджаную для іх «чарнобыльскай» зоны складанасць. На забруджаныя тэрыторыі, як у іх, попыт быў і так не вялікі, але папярэдні закон забараняў узаконіць маёмасць на тэрыторыі Яноўскага сельсавета нават жыхарам Краснаполя. Даходзіла да абсурду: чалавек купляў дом, а потым не мог перапісаць яго на сваё імя. Каб легалізаваць нерухомасць на тэрыторыі сельсавета, трэба было мець рэгістрацыю.

Пра аналагічныя праблемы расказвае і **старшыня Глускага райсавета Вячаслаў АСТАШЭВІЧ.**

— У савецкі час сем'ям выдзялялася і 40 «сотак», і 50, а калі памеры абмежавалі да 25, спадчыннікі сталі адмаўляцца ад лішніх «сотак», — кажа суразмоўнік. — Права на ўсю зямлю можна было атрымаць толькі пры рэгістрацыі ў сельскім доме. Толькі хто дзеля гэтага рызыкнуў бы выпісацца з гарадской кватэры? Таму народ пераважна адмаўляўся ад звышнарматыўнай спадчыны. Новы закон дае магчымасць без валакіты вырашыць гэтае пытанне.

Наколькі змяненні актуальныя для вёскі, нават не варта абмяркоўваць. Сёння, на жаль, захоўваецца сумная для невялікіх населеных пунктаў тэндэнцыя. Сельскае насельніцтва з кожным годам скарачаецца, а самі вёскі змяншаюцца ў памерах. Напрыклад, на тэрыторыі Глускага раёна Дзяржлесфонду летась было перададзена 425 гектараў зямлі, сёлета — ужо 195.

— Жадаючых атрымаць сельскую прапіску сёння мала, — уздыхае Вячаслаў Асташэвіч. — І мы толькі зацікаўленыя ў тым, каб працэдура афармлення зямлі была для жадаючых пераехаць у вёску грамадзян прасцейшай. Новы закон гэтаму спрыяе. Цяпер памеры зямельных участкаў, якія можна ўзяць у сваё карыстанне, павялічыліся да гектара. І гэта цудоўна. Такі падыход дазволіць уключыць у грамадзянскі абарот землі, якія пакуль не выкарыстоўваюцца, а таксама ліквідаваць цераспалосіцу паміж зямельнымі ўчасткамі — адным словам, навесці парадак на зямлі.

Больш выразнай стане і працэдура разгляду зямельных пытанняў. Пры ранейшым заканадаўстве гэтым павінен быў займацца сельвыканкам. Але складанасці ўзнікалі яшчэ на першым этапе. Камісія павінна складацца са спецыялістаў розных структурных падраздзяленняў, а ў сельвыканкаме — усяго толькі старшыня ды кіраўнік спраў.

— Паводле новага Кодэкса, зямельныя спрэчкі будуць разглядацца раённай камісіяй, і гэта толькі на карысць усім, — удакладняе Вячаслаў Асташэвіч. — Менш будзе зваротаў у розныя дзяржаўныя органы. Змяненні дапамогуць удасканаліць зямельныя адносіны і ліквідаваць праблемы землекарыстальнікаў, якія не маглі вырашыцца працяглы час.

Садаводчыя таварыствы чакаюць

У раёнах спадзяюцца, што новы Кодэкс аб зямлі створыць больш прывабныя ўмовы і для такіх утварэнняў, як садаводчыя таварыствы. Падчас аднаго з выязных прыёмаў грамадзян у Асіповічах спікер верхняй палаты беларускага парламента Наталля Качанава падрабязна распытвала заяўніка — старшыню садаводчага таварыства, які прыйшоў на прыём з набалелым пытаннем. Потым у размове з журналістамі яна растлумачыла, што апошнім часам усё больш людзей закранае тэму безгаспадарных зямельных участкаў, у тым ліку ў садаводчых таварыствах. «У сённяшняй моладзі няма той зацікаўленасці ў рабоце на зямлі, якая была ў іх бацькоў, — падкрэсліла яна. — І нельга дапускаць, каб гэтыя землі прыходзілі ў запусценне. Трэба шукаць новыя падыходы, каб урэгуляваць пытанне».

Некалькі гадоў таму ў рэдакцыю нашай газеты звярнуўся чалавек, які паскардзіўся, што яму адмовілі ў набыцці ўчастка ў садаводчым таварыстве. Апошні не адпавядаў устаноўленым параметрам, і каб не парушыць закон, трэба было ўнесці змяненні ў генплан. А гэта было нятанна. Мужчыну прапанавалі выдаткі ўзяць на сябе. Участак пры гэтым атрымліваўся залаты. І суіскальнік абурыўся. Цяпер такіх праблем нават не павінна ўзнікаць. Новым Кодэксам прадугледжана змяненне граніц у рамках садовых таварыстваў без унясення змяненняў у праект.

— Сапраўды, па садаводчых таварыствах, якія былі створаны ў 1990-я гады, існавалі пэўныя праблемы. І карэкціроўка закона дапамагла іх вырашыць, — адзначае **начальнік аддзела землеўпарадкавання Асіповіцкага райвыканкама Наталля ПУЛІНОВІЧ.** — Як правіла, у такіх таварыствах існуе шчыльная забудова, а памеры адзінкавых пустых участкаў ужо не адпавядаюць генпланам 1990-х гадоў. Каб чалавек мог атрымаць той участак, садаводчае таварыства павінна было звярнуцца ў праектную арганізацыю з мэтай змяніць памеры зямельнага надзела. Толькі пасля ўнясення змяненняў грамадзяніну дазвалялася аформіць зямлю на сябе. У іншым выпадку яму адмаўлялі. Новы закон дазваляе мяняць граніцы зямельных участкаў без унясення змяненняў у праект. Можна нават дадаткова

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ўзяць 15 «сотак», незалежна ад наяўнасці іншых участкаў і іх плошчы.

Наогул зямельнага «голаду» пры новым заканадаўстве дакладна не прагназуецца.

— Сёння на абслугоўванне жылога дома прадугледжана не 25 «сотак», як гэта было раней, а цэлы гектар, — падкрэслівае Наталля Пуліновіч. — Яшчэ адзін плюс у тым, што жадаючым набыць участак для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі цяпер не абавязкова рэгістравацца ў сельсавеце. Для гэтых мэт можна атрымаць да чатырох гектараў зямлі, нават калі ў карыстанні ўжо ёсць участак, прычым незалежна ад яго плошчы і мэтавага прызначэння.

Хочаце — будуйцеся

Для вёскі самавольная пабудова — справа звычайная. Зямля натхняе на заняткі стыхійнай творчасцю. Захацеў, пабудаваў хлеў, захацеў — лазню. Успамінаю, як у адным з раёнаў на прыём прыйшоў чалавек і паскардзіўся, што не можа зарэгістраваць лазню. Яна ў яго на метр не ўпісалася ў памеры участка. Адказ быў не на карысць грамадзяніна. Пабудову прыйшлося знесці. Хоць бывала па-рознаму. У Асіповічах згадалі гісторыю са шчаслівым фіналам. Аднак шлях вырашэння быў няпростым.

— Райвыканкам разглядаў пытанне наконт крамы, якая пры будаўніцтве выйшла за межы дазволенай плошчы зямельнага ўчастка, — расказвае Наталля Пуліновіч. — Паколькі яна не парушала архітэктурных, санітарных і іншых нормаў, было прынята рашэнне аб яе захаванні. На падставе гэтага рашэння райвыканкам хадайнічаў перад аблвыканкамам, а той, у сваю чаргу, рыхтаваў пакет дакументаў на імя Прэзідэнта. І толькі пасля дазволу вышэйшай інстанцыі краму легалізавалі.

Цяпер такія пытанні можна будзе вырашаць на мясцовым узроўні. Старшыня Глускага райсавета Вячаслаў Асташэвіч спадзяецца, што новы закон пойдзе вёсцы на карысць.

— Мяркуйце самі, — аргументуе ён. — Па-першае, павялічваюцца памеры зямельных участкаў, па-другое, ёсць магчымасць атрымаць дадатковы ўчастак для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома без распрацоўкі праекта, па-трэцяе, сельсаветы атрымалі магчымасць арганізоўваць пашы для свойскай жывёлы на землях сельгаспрызначэння. Усё гэта будзе садзейнічаць развіццю асабістай падсобнай гаспадаркі ў вёсцы і прыцягваць сюды людзей.

Зямля ў спадчыну

Спецыялісты, якія працуюць з зямельным заканадаўствам, лічаць, што плюсоў у ім стала значна больш. Можна будзе, напрыклад, памяняць мэтавае прызначэнне участка, які дадзены для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі. Замест, умоўна кажучы, хлява можна пабудаваць, напрыклад, жылы дом. Раней такое рабіць не дазвалялася.

Калі ўчастак браўся пад дом, а на ім пабудавалі краму, яе таксама можна сёння ўзаконіць. Але з гэтым прыйдзецца пачакаць. Яшчэ не распрацаваны механізм, які потым прапішуць у лакальных дакументах.

Дарэчы, для тых, хто атрымаў у спадчыну ўчастак больш за 25 «сотак» і хоча легалізаваць астатнюю тэрыторыю, ёсць два варыянты. Калі зямля патрэбная для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, рэгістрацыя абыдзецца ў пэўную суму. Але ў гэтым выпадку зямля пяройдзе ў пажыццёвую ўласнасць і зможа перадавацца ў спадчыну. Незалежна ад таго, будзе там нешта пабудавана або не. А вось калі ў чалавека на зямлю вялікіх планаў няма, яму яна патрэбная выключна для агародніцтва, то і плаціць нічога не трэба. Зямля бярэцца ў часовае карыстанне да 10 гадоў, але пры жаданні можна працягнуць тэрмін часовага карыстання або адмовіцца ад участка.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Дарэчы

Самавольныя пабудовы можна ўзаконіць

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 253 «Аб спрошчаным парадку прыёмкі ў эксплуатацыю аб'ектаў будаўніцтва», паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Дакументам прадастаўлена права мясцовым выканаўчым і распарадчым органам прымаць у эксплуатацыю аднакватэрныя жылыя дамы і нежылыя пабудовы, узведзеныя грамадзянамі без дазволаў і праектнай дакументацыі (за выключэннем размешчаных у Мінску). Пры гэтым такія пабудовы не будуць прызнавацца самавольнымі.

Указ уступае ў дзеянне з 1 верасня 2022 года і мае часовы характар (да 1 студзеня 2025 года). Дакумент дазволіць узаконіць самавольныя пабудовы, узведзеныя грамадзянамі на зямельных участках, атрыманых імі да 1 верасня 2022 года.

СБЕР БАНК

Уважаемые Владельцы (физические лица)
текущих (расчетных) счетов, в том числе с использованием банковской платежной карточки, благотворительных счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «Сбер Банк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – неактивные счета)!

Сообщаем Вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.

Настоящим уведомляем Вас об отсутствии по Вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам текущих (расчетных) счетов с использованием банковской платежной карточки, будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.

Если в течение 6 месяцев, начиная с даты настоящего уведомления, Вы не возобновите движение денежных средств по неактивному счету, Банк прекратит обязательства по соответствующему договору и закроет его, перечислив неиспользованный остаток денежных средств на отдельный счет без начисления процентов, и по истечении срока, установленного законодательством Республики Беларусь, зачислит его в доход Банка.

При этом Банк обязуется возвратить по требованию Владельца неактивного счета остаток денежных средств, находившихся на данном счете на момент его закрытия.

В отношении текущих (расчетных) счетов, открытых с 20.05.2020, а также текущих (расчетных) счетов, доступ к которым обеспечивается при использовании банковской платежной карточки, открытых с 05.05.2017, (далее – текущие счета) с 02.11.2020 Банком введен тариф за обслуживание таких счетов в случае отсутствия движения денежных средств на них при наступлении условий, предусмотренных договором об открытии текущего счета.

Операции по Счетам могут совершаться в подразделениях Банка и (или) в системе «СберБанк Онлайн».

Информацию о режиме работы подразделений можно получить по телефону: 148 – в стационарной и мобильных сетях (+375 25/ 29/ 44) 5-148-148 – в том числе для международных звонков

УНП 100219673

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**Ремонтно-строительный филиал Московского района ОАО «Минскремстрой», г. Минск, ул. Глаголева, д. 45**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**
Предмет электронных торгов – транспортное средство, бывшее в употреблении	
Автомобиль Hafei Saima HFJ7160-201 (рег. знак 5824 ЕО-7), 2007 г. в. Местонахождение: г. Минск, ул. Глаголева, д. 45	
Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 320,00 бел. руб.	
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после проведения торгов	
Условия оплаты предмета электронных торгов	
Предмет аукциона должен быть оплачен покупателем (претендентом на покупку) в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи	
Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by	
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере 7 % от цены продажи предмета торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов	
Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 29.08.2022 в 11.00. Окончание торгов: 29.08.2022 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 26.08.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06
E-mail: auction@cpo.by

Информация о проведении аукциона **26 августа 2022 г.** по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

в **д. Осово, д. Жажелка**

Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области.
Организатор аукциона:
Жодинский сельский исполнительный комитет,
222161, г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	д. Осово	624881710 301000044	0,1306 га	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	5 000,00
2	д. Жажелка	624881705 601000180	0,1297 га	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	9 000,00

Аукцион состоится 26 августа 2022 г. в 10.00 в Жодинском сельском и исполнительном комитете по адресу: г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3, кабинет № 1.

Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, Смолевичского райисполкома: http://www.smolevichi.gov.by

УНП 600023532

ХЛЕБ НА КАНТРОЛІ СЕЛЬСАВЕТА

Якую ролю адыгрывае мясцовая ўлада ва ўборачнай кампаніі

У сельгаспрадпрыемствах Віцебшчыны гарачая пара: дарагія кожная хвілінка і кожны праменьчык сонца, каб паспець убраць ураджай у кароткі тэрмін. З-за спецыфічных кліматычных умоў паўночны рэгіён па традыцыі падышоў да жніва апошнім, але механізатары ўжо зрабілі вялікія крокі на шляху да будучага каравая.

Фота БелТА.

Гаспадарка «Азярцы» Глыбоцкага раёна ўбірае азімы ячмень на эксперыментальным участку.

У гэтыя апошнія ліпеньскія дні на дапамогу гаспадаркам выходзяць розныя службы і арганізацыі, бо пакуль надвор'е спрыяе, працэс жніва бесперапынны. Сёлета каля 120 студэнтаў факультэта механізацыі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі дапамагае на палях Віцебскай і Магілёўскай абласцей. Добрай традыцыяй Віцебскага дзяржаўнага прафесіянальна-тэхнічнага каледжа сельскагаспадарчай вытворчасці стала выпраўленне найлепшых навучэнцаў на дапамогу аграрыям Віцебскага раёна на пасяўную і ўборачную кампаніі. Плюсоў шмат: гэта добры шанц азнаёміцца з прафесіяй знутры, падзарабіць і зарэкамендаваць сябе для далейшага працаўладкавання.

Актыўны ўдзел ва ўборачнай кампаніі бяруць органы мясцовага самакіравання. Вядома, старшыні сельскіх Саветаў не садзяцца за камбайны і не выходзяць на палі — яны трымаюць на строгім кантролі працэс уборкі. «Распарадак дня сапраўды гарачы: пяць разоў на тыдзень я дзяжуру на нашых палях. Неабходна сачыць за аховай працы, заканчэннем рабочага дня работнікаў, ад'ездам тэхнікі. У мае абавязкі ўваходзіць кантроль за добрасумленнай работай камбайнераў: каб не пакідалі нязжатым калоссе ў нізінах і цяжкадаступных месцах», — расказала **выконваючая абавязкі старшыні Заронаўскага сельсавета Віцебскага раёна Алеся СІНЯКОВА.**

Пасля масавага жніва сельскагаспадарчай тэхніцы прайстойваць не прыйдзецца: пачнецца ўборка хлеба на прысядзібных участках. Дапамога мясцовых гаспадарак даўно стала добрай традыцыяй, за што жыхары шчыра дзякуюць. «За невялікія грошы мае «соткі» будуць хутка ўбраныя, не давядзецца жаць сярпом — працэс працаёмкі, камусьці не па сілах з-за ўзросту, камусьці — з-за занятасці. У мяне вялікая гаспадарка: карова, свінні, куры, а муку любяць усе», — падзялілася Наталля Юр'еўна, жыхарка вёскі Пестуніца Заронаўскага сельсавета. Мясцовыя органы ўлады з'яўляюцца сувязным звяном паміж насельніцтвам і арганізацыямі: збіраюць заяўкі ад гаспадароў, дамаўляюцца наконт тэхнікі і часу, а яшчэ дапамагаюць моладзі з уладкаваннем на зернесушыльныя комплексы на летні перыяд.

Уборачная кампанія ў Віцебскім раёне знаходзіцца на кантролі не толькі сельсаветаў, але і праваахоўнікаў. Праводзіцца рэгулярны маніторынг стану сельгастэхнікі, аховы і тэхнічнага ўмацавання мехдвароў, зернесушыльных комплексаў, умоў захоўвання сабранага ўраджаю. Заахвочвае механізатараў на высокія вынікі жніва раённая прафсаюзная арганізацыя работнікаў АПК, якая рэгулярна праводзіць працоўныя спаборніцтвы.

Наколькі багатым атрымаецца каравай Віцебшчыны, даведаемся на абласным фестывалі-кірмашы працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2022», якія сёлета пройдзе ў горадзе Глыбокае.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

КАБ ВАДА — НЕ БЯДА, А ДАРОГА — НЕ ТРЫВОГА

Калі дэпутат прыязджае ў сельсавет...

Вопытам асабістых прыёмаў жыхароў амаль трох дзясяткаў сельскіх Саветаў дзеліцца дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Ігар ЗАВАЛЕЙ.

У зоне адказнасці парламентарыя — населеныя пункты Добрушскага раёна і 15 сельскіх Саветаў Гомельскага. Штомесяц Ігар Уладзіміравіч сустракаецца з жыхарамі аграгарадкоў і вёсак на тэрыторыі сваёй выбарчай акругі. Ставіць для сябе задачу дапамагчы вырашыць хвалюючыя пытанні, выслухаць прапановы, даць тлумачэнні па заканадаўчай базе. Словам, як мага лепш ацаніць жыццё людзей у глыбінцы і ўсвядоміць праблемы, з якімі яны сутыкаюцца.

Падчас апошняга прыёму грамадзян у Маркавіцкім сельвыканкаме Гомельскага раёна адрасаваць зварот парламентарыю змаглі таксама жыхары іншых сельскіх Саветаў. На асабісты прыём да Ігара Завалея запісаліся вяскоўцы, якія агучылі праблемныя пытанні, што закранаюць інтарэсы многіх жыхароў. Так, дэпутат Маркавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Алена Шыпкова ад імя аднавяскоўцаў агучыла: людзі заклапочаныя лёсам сельмага райспажыўтаварыства.

— Прадавец, які тут працуе, узяла працяглы водпуск, а жанчына, што прыйшла ёй на замену, праз некалькі дзён звольнілася, — расказала Алена Валянцінаўна. — Вось і турбуемся: ці адкрыецца крама праз некаторы час?

Яна паведаміла, што вяскоўцы цікавяцца, ці можа з'явіцца на іх тэрыторыі крама буйнога рытэйлера. Як высветлілася, гаворка аб закрыцці існуючага гандлёвага пункта райспажыўтаварыства не ідзе. Прадавец крамы, якая працуе ўвесь час, хутка вернецца на рабочае месца.

Налічэнне пенсіі і шэраг бытавых пытанняў падчас асабістага прыёму парламентарыю адрасаваў жыхар Маркавічаў Анатоль Чарняк. Вясковец атрымаў тлумачэнні па хвалюючых для яго пытаннях адразу ж на месцы. На прамую лінію да Ігара Завалея таксама звярнулася Любоў Ермалаева — жыхарка пасёлка Іванькаў Цярэніцкага сельсавета Гомельскага раёна. Жанчына ўзняла праблему добраўпарадкавання свайго населенага пункта. Прагрэйдзіравана дарога, абкошана абочына, а гаспадарка атрымала прадпісанне навесці парадак на сваёй тэрыторыі — на тое, што частка праблемных момантаў па гэтым населеным пункце ўжо знята, звяртаюць увагу аўтары звароту.

— Традыцыйна большая частка хвалюючых пытанняў, якія ўзнімаюць вяскоўцы, датычыцца рамонту дарог. Пасля кожнага прыёму імкнуся выехаць на месца, каб пераканацца і на свае вочы паглядзець, ацаніць агучаную дарожную праблему, — дзеліцца дэпутат Палаты прадстаўнікоў.

Парламентарый адзначае: вельмі часта на асабісты прыём да яго прыходзяць людзі з праблемай транспарту на вёсцы — як дабрацца да таго ці іншага населенага пункта, агучваюцца скаргі на расклад рэйсавых аўтобусаў. Адзін з апошніх прыкладаў вырашэння падобнага праблемнага пытання пры ўдзеле парламентарыя — лёс цягніка «Гомель — Куток» у Добрушскім раёне.

— Удалося вырашыць пытанне па захаванні рэйсаў, з якім звярнуліся мясцовыя жыхары. Так, да пэўных прыпынкаў у вячэрні час даязджала няшмат людзей. Але калі б цягнік зусім адмянілі, некалькі дзясяткаў людзей усё ж такі страцілі б магчымасць належным чынам вярнуцца дадому пасля работы. Было прынята рашэнне скласці ліст у адрас кіраўніцтва Гомельскага аддзялення БЧ. Атрымалася пераканаць, — адзначае Ігар Завалей.

На прамых тэлефонных лініях і асабістых прыёмах вяскоўцы таксама звяртаюцца да яго па дапамогу з праблемамі вулічнага асвятлення, якасці пітной вады.

— Вядома, дзякуючы праграме «Чыстая вада» ў рамках дзяржпраграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе», абвешчанай на 2021—2025 гады, адкрываюцца станцыі абезжалезвання, праводзіцца замена зношаных сетак, што асабліва актуальна ў сельскай мясцовасці. Але вырашыць усе праблемныя моманты і задачы, на жаль, немагчыма ў адзін момант, — дадае дэпутат. — Увогуле, варта адзначыць, што падчас работы на тэрыторыі выбарчай акругі паступае дастатковая колькасць зваротаў па тлумачэнні тых ці іншых заканадаўчых актаў, патрабаванняў і пастаноў. Паступаюць і канструктыўныя прапановы ад людзей па заканатворчай дзейнасці народных абраннікаў, што не можа не радаваць.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота Дар'і КАЙМОВІЧ.

КОД ДА ПАМЯЦІ

Па ініцыятыве дэпутата райсавета ў Гомелі праводзяць культурна-гістарычны эксперымент

Аверсайз-футболка і спадніца маларыцкага строю ад прапрабабулі, чаравікі ў стылі гранж і вытканыя больш за сто гадоў таму кашуля і намітка... Адмысловы культурна-гістарычны эксперымент абвясцілі ў Гомелі. Гісторыкі і фатографы прапануюць моладзі выкарыстоўваць элементы беларускага нацыянальнага строю ў гарадскіх штодзённых камплектах адзення. Што з гэтага атрымалася, можна ўбачыць на выставачным праекце «Код да памяці», якія прадстаўлены ў гомельскім Музеі гісторыі друку і фатаграфіі.

Дэпутат Гомельскага раённага Савета дэпутатаў, намеснік старшыні Камісіі па справах непаўналетніх Гомельскага райвыканкама Кацярына ВАЎЧОК.

Нацыянальны касцюм — як тысячы навуковых прац па гісторыі, сканцэнтраваныя ў адной рэчы. Яго культурны код можна і варта «чытаць» — спрабаваць раскрыць сакрэты, выкарыстоўваць ў звычайным жыцці, увогуле ганарыцца, што ты яго носьбіт. Гэта тыя ідэі, якія натхнілі на незвычайны «касцюмны» эксперымент гісторыкаў па адукацыі — **дэпутата Гомельскага раённага Савета дэпутатаў, намесніка старшыні Камісіі па справах непаўналетніх Гомельскага райвыканкама Кацярыну Ваўчок і дырэктара «Майстэрні інавацыйных тэхналогій» Уладзіміра АЛЕКСАНДРОНЦА**.

— Два гады таму ў Музеі гісторыі Гомеля мы з Уладзімірам ужо прадстаўлялі маштабны аўтарскі фотапраект «Кола жыцця Беларуса», — тлумачыць Кацярына Ваўчок. — У сваёй асноўнай прафесіянальнай дзейнасці мы абое працуем з педагогамі, вучнямі-падлеткамі, моладдзю, і да гэтай ідэі патрыятычнага выхавання праз культурна-гістарычную спадчыну ўжо немагчыма астыць.

Для новага праекта паставілі задачу стварыць вобраз маладой сучаснай беларускі, якая кожны дзень бяжыць на вучобу або на работу. Дзяўчына — адкрытая свету, нефармальная і нефарматная, магчыма, з татуіроўкамі ці пірсінгам, але ў сваіх штодзённых вобразах яна міксуе моднае для моладзі адзенне з элементамі нацыянальнага касцюма. Так гэта ўжо больш, чым проста дзяўчына з вуліцы! Яна — «Код да памяці» — перадае гонар за бабуль і прабабуль, што саткалі калісьці гэтыя рэчы.

Сааўтарамі праекта на дабрачынных пачатках сталі прафесіянальны фотограф Алена Ганчарова і фотааматар Ганна Малашанка. Дзяўчат-мадэляў вельмі хутка адшукала Ганна Малашанка. Стаць фотагераінямі з радасцю пагадзіліся будучыя настаўніцы — навучэнкі Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа імя Выгоцкага. А вось на пошук і падбор касцюмаў для лукаў спатрэбілася некалькі месяцаў.

— Частку элементаў адзення для здымак выкарысталі з маёй асабістай калекцыі, — тлумачыць Кацярына Ваўчок. — Але ў нас было толькі тры поўныя камплекты адзення — унікальны маларыцкі строй, касцюмы з Неглюбкі Веткаўскага раёна і вёскі Маркавічы Гомельскага раёна. Усе іншыя прадметы гардэробу збіралі паасобна.

Так, у праекце можна паглядзець элементы строяў з Магілёўскага, Чачэрскага і Гомельскага раёнаў. Унікальныя па сваёй гістарычнай каштоўнасці часткі нацыянальных гарнітураў дэпутату райсавета перадалі педагогі Грабаўскай, Чарацянскай, Маркавіцкай школ Гомельскага раёна.

— У іх прышкольных музеях сабраныя вельмі багатыя калекцыі нацыянальных касцюмаў. Іх мы бралі на сваю адказнасць, і школьныя музейшчыкі не баяліся за іх, а, наадварот, былі вельмі радыя такім чынам паўдзельнічаць у нашым праекце. Вярнулі строі цэлымі і спраўнымі, — прадухіляе маё пытанне Кацярына Ваўчок.

Яна ў праекце якраз выступала «дырэктарам па касцюмах». Расказвае Кацярына Мікалаеўна і аб дэталях падрыхтоўкі да здымак. Напрыклад, сустрэліся ўсе героі толькі на фоталакацыях. Дзяўчаты-мадэлі прыйшлі пры такім грунтоўным макіяжы, з вялікай колькасцю ўпрыгажэнняў, тату і пірсінг — таксама навідавоку. Між тым, калі пачаўся працэс пераадзявання і камбінавання вобразаў, усё змянілася. Дзяўчынкі, якія ніколі прафесіянальна не пазіравалі перад камерай, вельмі хутка і арганічна ўвайшлі ў вобраз. Знялі ўсё кадры на вуліцы за тры гадзіны.

— Быў цікавы момант на здымках, — згадвае дэпутат. — Да нас падчас пошуку лакацый для фота далучыўся юнак, знаёмы нашага фатографа. Ён назіраў за працэсам. Здымалі кадр з дзяўчынай у намітцы, а гэты элемент моладзь заўсёды ўспрымае максімальна архаічным. Я наматала намітку па ўсіх правілах на Аляксандру, і хлопца той вобраз быццам зачараваў. Прызнаўся, што проста ў звыклым маладзёжным адзенні гэта дзяўчына была зусім іншай, а раскрыла яе дзявоцкую сілу менавіта намітка. Я ж не здзівілася такой яго рэакцыі, бо заўсёды кажу, што нацыянальны касцюм — гэта кроў ад крыві, таму такая арганічная для нашых дзяўчат.

«Код да памяці» прапануе ацаніць 20 фотаробот, зробленых як у класічнай студыйнай тэхніцы, так і ў нефармальнай аматарскай, знятай у вулічных умовах. Фотографы Алена Ганчарова і Ганна Малашанка падзяліліся, што мараць зрабіць і працяг гэтай гісторыі ў рэспубліканскім фармаце. Вельмі цікава было б таксама

зладзіць такія фотасесіі ў «жывой» вясковай хаце.

— Мой убор — гэта касцюм з вёскі Маркавічы, што ў Гомельскім раёне. Ведаю, што ён адметны змешанасцю стыляў, бо Маркавічы — прыгранічча, адчуваецца ўплыў і Гомельшчыны, і Чарнігаўшчыны. Але галоўнае, што ў гэтым строі я сапраўды «крутая», — шчыра прызнаецца мадэль і самая маленькая гераіня праекта, вучаніца 6 класа Гомельскай сярэдняй школы № 59 Вераніка Ваўчок. — Дарэчы, у гэтым касцюме вельмі камфортна і зручна рухацца.

Дзяўчынка падзялілася, што ў сваёй школе яна — актывістка

Дырэктар «Майстэрні інавацыйных тэхналогій» Уладзімір АЛЕКСАНДРОНЕЦ падчас інтэрв'ю газеце «Звязда».

культурна-масавай работы. Увосень, калі пачнуцца заняткі, яна раскажа аднакласнікам і настаўнікам аб сваім удзеле ў праекце. Марыць натхніць на падобны перформанс з касцюмамі і сваіх сябровак-аднакласніц, іх мам і бабуль.

Перакананая, што іскра ў сэрцы, падараная незвычайным культурным вопытам, дапамажа ёй у рабоце з дзецьмі і мадэль праекта Марыя Бондарава. Малады спецыяліст, настаўніца малодшых класаў, яна толькі-толькі атрымала размеркаванне на першае месца работы ў гомельскай школе.

— Мяне вельмі здзівіла і парадавала, як можна камфортна адчуваць сябе і пры гэтым модна, эфектна выглядаць, калі спалучыць элементы сучаснага адзення, упрыгажэнні, маладзёжны спартыўны абутак і саматкаць фартух, хустку. Цяжка перадаць словамі, але калі пераўвасабляешся ў такі вобраз, перажываеш цікавыя эмоцыі, пэўную дзявоцкую сілу ў сабе адчуваеш, — дадае малады педагог.

Пасля прэзентацыі праекта і фотавыставы яе аўтары ў сацыяльных сетках атрымалі дзесяткі станоўчых рэакцый і пасланняў ад жыхароў з самых розных населеных пунктаў Беларусі. Аўтары «Кода да памяці» спадзяюцца, што сваім прыкладам натхняць навучэнцаў, студэнтаў, педагогаў у школах, каледжах, ВНУ, дзе ёсць калекцыі касцюмаў, проста сем'і, што захоўваюць саматканае адзенне ад прабабуль, пераймаць падобны культурны вопыт.

— Наша мара, каб людзі на святы і ў сваім штодзённым жыцці хадзілі ў нацыянальных касцюмах ці выкарыстоўвалі ў адзенні элементы нацыянальнага строю, — выказвае агульную думку ўсіх сааўтараў праекта гісторык, дырэктар «Майстэрні інавацыйных тэхналогій» Уладзімір Александронец.

На яго погляд, вельмі важна данесці ідэю, што патрыятычныя праекты адгукаюцца ў сэрцах дзяцей і моладзі не толькі праз традыцыйныя формы

работы і афіцыйныя мерапрыемствы.

— Шмат хто прывык, што гістарычная культурная спадчына, усё захаванае да другой паловы XX стагоддзя — гэта ўсё музейнае, і чапаць яго нельга. Як жартуюць гісторыкі, «не дыхайце на экспанаты». Наша ідэя — гісторыя не можа быць толькі манументалнай, музеефікаванай. Пра сур'ёзныя, важныя, патрыятычныя рэчы можна і варта казаць не заўсёды ў строгай, фундаментальнай форме. Калі гісторыя не інтэгравана ў разумных межах, з разумным навуковым падыходам, у сучаснасць, падлеткам і моладзі цяжка адчуць яе.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота аўтара і з архіва герояў.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 26 ліпеня 2022 года.

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении 9 августа 2022 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена продажи с НДС, бел. руб.	Задаток (10 %) с НДС, бел. руб.
Местонахождение имущества: Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42			
1	Четырехцветная флексографическая машина с сушками УФ (UV) лучей, коронатором и ракельными ножами	19 080,00	1 908,00
2	ПВЭМ «LinkT», инв. № 2928	72,00	7,20
3	Монитор Philips 227E3L PHSU, инв. № 2939	42,60	4,26
4	Многофункциональное устройство HP LJ Pro M1536dnf CE538A, инв. № 3303	126,00	12,60

Продавец: ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз», Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42.
Контактный телефон +375 29 655 50 51.
Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.
Для участия в аукционе необходимо:
1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030026000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**
2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.
Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 08.08.2022 г. в 17.00.
Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.
С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу по предварительному согласованию с ликвидатором.
Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с пятипроцентным шагом. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).
Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. УНП 191224638**
Продавец	**ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70. УНП 100770618. Тел. +375 29 6139869**

Предмет аукциона

Лот № 1

Ограждение бетонное (инв. номер 980773).
Месторасположение: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12

Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 2 754,72 дол. США
Шаг аукциона – 137,74 дол. США

Адрес: г. Минск, пр-т Пушкина, 70
Лот № 2

Наименование	Общ. пл.	Инвен. номер
Административное, производственное	2007,2 кв. м	500/С-21619

В состав лота входит оборудование: перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by)

Сведения о земельном участке: пл. **0,3600 га** предоставлен продавцу на праве постоян. пользования. ***Ограничения (обременения) прав:*** охранные зоны технич. водопровода (пл. 0,0883 га), газофикации сред. давления (пл. 0,0414 га)

Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 828 065,53 дол. США
Шаг аукциона – 41403,28 дол. США

Лот № 3

В состав лота входят: **домик-сторожка** (инв. № 2), **ограждение из металлич. сетки** (инв. № 4), **ворота самонесущие с электромехан. приводом и калиткой** (инв. № 5), **теплотрасса** (инв. номер 30121)

Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 3 006,00 дол. США
Шаг аукциона – 150,30 дол. США

Лоты №№ 4–15 – оборудование, бывшее в употреблении
Месторасположение: г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70

Лот №	Наименование	Инвен. №	Начальная цена (с НДС 20 %), дол. США	Шаг аукциона*, дол. США
4	**Аппарат гидроабразив. резки**	70103	**28 833,60**	1441,68
5	**Вертик. обрабат. центр с ЧПУ ECO CENTER 350 CNC с системой упр. GPPlus 450**	70089	**10 657,98**	532,90
6	**Обрабат. центр(Si) Vector 1500 CNC*CNC**	41031	**27 723,60**	1 386,18
7	**Полуав-т для пайки дорож. резцов модели АПЗ-124**	70124	**25 189,20**	1259,46
8	**Полуавтомат для пайки дорож. резцов модели АПЗ-4**	41028	**18 213,12**	910,66
9	**СТАН СП-2000**	41008	**50 000,00**	2500,00
10	**Техн. линия по производ. путев. шуруп. на базе стана попереч.-клин. с инд. нагрев. SPL2500-2-IH-133**	70179	**392 445,00**	19622,25
11	**Токар. станок с ЧПУ Fanuc Oi-Mate с накладной станиной Compact 330**	41034	**12 760,20**	638,01
12	**Станок консольно-фрез. BM127M**	41019	**4 104,00**	205,20
13	**Станок отрезной ДОС**	41012	**129,60**	6,48
14	**Станок Hedelius -CB 80 Magnum**	70147	**40 726,56**	2036,33
15	**Робот промышленный KUKA KR 150 со шкафом управления и соединительными кабелями**		**23 246,35**	1162,32

***Шаг аукциона**	Шаг аукциона определяется продавцом в фиксированной сумме, которая не может составлять менее 5 % от начальной цены предмета торгов и не изменяется в течение всего аукциона
Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона	
**Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона*	
Порядок ознакомления: в рабочие дни по предварительному согласованию, тел. +375 (29) 6139869, Дмитрий	
Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публич. торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидир. юридич. лица». С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**	
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях пересчитывается на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»	
Срок подписания договора купли-продажи – 7 (семь) дней после проведения аукциона	
Срок оплаты предмета аукциона: не позднее **7 (семи) календарных дней** со дня проведения аукциона	
Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере; **по лотам № 1 – 14 – 3 %, по лоту № 15 – 5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона	
Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 08.07.2022	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Дата и время проведения аукциона	**12.08.2022 в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Дата, время начала и окончания приема заявлений	**с 09.00 27.07.2022 до 17.00 11.08.2022, по тому же адресу**

Контактные телефоны:
+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@ipmconsult.by

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Станок точ. шлиф, инв. № 62-О	219,60	21,96	10,98
2	Станок КС шил, инв. № 626	720,00	72,00	36,00
3	Станок 7д36 поперечно-строгальный, инв. № 687	720,00	72,00	36,00
4	Станок хонинговальный 3г 883, инв. № 692	684,00	68,40	34,20
5	Станок хонинг. 3г 883, инв. № 703	684,00	68,40	34,20
6	Станок 3к633 обд-шлиф., инв. № 716	291,60	29,16	14,58
7	Емкость 10 м³, инв. № 103-ОС3	360,00	36,00	18,00
8	Цистерна 50 м³, инв. № 114-1-О	828,00	82,80	41,40
9	Цистерна 50 м³, инв. № 114-2-О	828,00	82,80	41,40
10	Станок деревообр. СРВ-1, инв. № 502	1056,00	105,60	52,80
11	Станок СФУ 46810 шил., инв. № 625	508,20	50,82	25,41
12	Станок ВМС, инв. № 662Т	924,00	92,40	46,20
13	Станок гориз-фрез. шил., инв. № 685	858,00	85,80	42,90
14	Станок расточный шил., инв. № 693	1914,00	191,40	95,70
15	Станок обдирочно-шлифовальный дт-2 ш, инв. № 700	990,00	99,00	49,50
16	Станок мк184-5 свер. шил., инв. № 719	1122,00	112,20	56,10
17	Фреза почв. дмр-4000, инв. № 1326	7656,00	765,60	382,80
18	Сеялка пневм. мт-6f, инв. № 1327	7854,00	785,40	392,70
19	Фреза почв. дмр-4000, инв. № 1333	7656,00	765,60	382,80
20	А/маш. Зил 554 76-07а 5 желн., инв. № 1390а	2046,00	204,60	102,30
21	Доил. устан. 2адсн, инв. № 3051А	3366,00	336,60	168,30
22	Весы вш-2001 (1), инв. № 306аТ	66,00	6,60	3,30
23	Весы вш-2001 (2), инв. № 3066Т	66,00	6,60	3,30
24	Весы вш-2001 (3), инв. № 306вТ	66,00	6,60	3,30
25	Водонаг. вгк-70 осип, инв. № 440А	22,44	2,24	1,12
26	Емкость 25 м³, инв. № 565	620,40	62,04	31,02
27	Электросирена с-40, инв. № 6003	178,20	17,82	8,91
28	Водораздатчик ву-3а, инв. № 659Т	726,00	72,60	36,30
29	Транспортер тсн-160 (4), инв. № 682Т	990,00	99,00	49,50
30	Станок 3к 634 обд-шлиф., инв. № 721	270,60	27,06	13,53
31	Емкость Осиповичи 5 м³, инв. № 104-О	530,40	53,04	26,52
32	Емкость Осипивичи 5 м³, инв. № 105-О	530,40	53,04	26,52
33	Цистерна Осиповичи 10 м³, инв. № 113-О	780,00	78,00	39,00
34	Емкость д/топлива п/х 5 м³, инв. № 1766	530,40	53,04	26,52
35	Автомобиль lada52-88ак-, инв. № 19170	780,00	78,00	39,00
36	Цистерна 25м (1), инв. № 225Т	678,60	67,86	33,93
37	Цистерна д/т 10 м³ (3), инв. № 226вТ	780,00	78,00	39,00
38	А/м ГАЗ 31105 38-63 ва-5, инв. № 310-О	936,00	93,60	46,80
39	Индикатор влажности WILE 26, инв. № 314Т	101,40	10,14	5,07
40	Влагомер сена, сенажа си Фауна-М, инв. № 316	57,72	5,77	2,89
41	Электротельфер 13 м, 3 т, инв. № 5001	694,20	69,42	34,71
42	Каток водоналивной, инв. № 52-О	936,00	93,60	46,80
43	Охладитель молока, инв. № 52-О2	1326,00	132,60	66,30
44	Сварочный аппарат(сак() –о, инв. № 6017-О	780,00	78,00	39,00
45	Емкость 3 м³ б/у, инв. № 6026	226,20	22,62	11,31
46	Борона б/у, инв. № 6028	124,80	12,48	6,24
47	Фреза ДМР-4000 б/у, инв. № 6029	9048,00	904,80	452,40
48	Прицеп б/у 4796аа5, инв. № 6036	585,00	58,50	29,25
49	Охладитель молока, инв. № 611Т	1950,00	195,00	97,50
50	Автомобиль груз.mercedes 410d 2519ар-58, инв. № 6014	3120,00	312,00	156,00
51	Водораздатчик вчс-3 2 м³, инв. № 619Т	304,20	30,42	15,21
52	Сеялка ферабокс, инв. № 691Т	4992,00	499,20	249,60
53	Ножницы шил., инв. № 717	709,80	70,98	35,49
54	Прицеп 2птс4, инв. № 77	390,00	39,00	19,50
55	Кран 0,5 т шил., инв. № 786	585,00	58,50	29,25
56	Емкость б/у 10 м³, инв. № 840	1092,00	109,20	54,60
57	Кран опорный гп шил. 11 м, 3 т, инв. № 878	2418,00	241,80	120,90
58	Кран опорный гп шил. 11 м, 2 т, инв. № 879	2106,00	210,60	105,30
59	Кранбалка 11 м шил., 2 т, инв. № 886	2106,00	210,60	105,30
60	Грабли колесно-пальцевые ГРЛ-8,5, инв. № 1340	3648,00	364,80	182,40
61	Мтз-82 77-176э, инв. № 14-О	5856,00	585,60	292,80
62	Станок сом-400б, инв. № 1568	528,00	52,80	26,40
63	Водонагреватель, инв. № 3062	480,00	48,00	24,00
64	Водонагреватель, инв. № 3074	480,00	48,00	24,00
65	Водонагреватель, инв. № 321-О	57,60	5,76	2,88
66	Водонагреватель, инв. № 322-О	57,60	5,76	2,88
67	Косилка ротац. навесная ас-1-014 рб, инв. № 6001	1440,00	144,00	72,00
68	Косилка ротац. навесн. Ас-1-01 рб, инв. № 6002	1440,00	144,00	72,00
69	Косилка ротац. навесная ас-1-02, инв. № 6005	1920,00	192,00	96,00
70	Мтз-82, Осип. 46-18мв, инв. № 8-О	8736,00	873,60	436,80
71	Станок токарно-винторезный 1Е61МТС, инв. № 829	2112,00	211,20	105,60
72	Мтз-80 02-636э, инв. № 9-О	4512,00	451,20	225,60

В отношении лотов №№ 1–9 проводятся шестые повторные торги.
Стоимость снижена на 70 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 39 (29661) от 26.02.2022, стр. 15, № 69 (29691) от 09.04.2022, стр. 10, № 83 (29705) от 29.04.2022, стр. 14, № 95 (29717) от 18.05.2022, стр. 15, № 113 (29735) от 11.06.2022, стр. 3, № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7.
В отношении лотов №№ 10–30 проводятся четвертые повторные торги.
Стоимость снижена на 45 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 69 (29691) от 09.04.2022, стр. 10, № 95 (29717) от 18.05.2022, стр. 15, № 113 (29735) от 11.06.2022, стр. 3, № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7.
В отношении лотов №№ 31–59 проводятся третьи повторные торги.
Стоимость снижена на 35 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 83 (29705) от 29.04.2022, стр. 14, № 113 (29735) от 11.06.2022, стр. 3, № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7. В отношении лотов №№ 60–72 проводятся вторые повторные торги.
Стоимость снижена на 20 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 101 (29723) от 26.05.2022, № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7.

Местонахождение лотов №№ 1–72: Минская обл., Вилейский р-н, д. Осиповичи

Дата и время проведения торгов	**В отношении лотов №№ 1–72: 09 августа 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127**
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**В отношении лотов №№ 1–72: с 10.00 27 июля 2022 года до 16.00 05 августа 2022 года**

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 09.08.2022.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7,5 % от конечной цены предмета торгов (по Лотам №№ 1–72).**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Чеслав, тел. +375299999112.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

Информация о продавце	**ОАО «Вилейский райагросервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375293489225, +375172552928 (222416, г. Вилейка, ул. 1 Мая 105, УНП 600010756)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

Падпіска-2022

«СА «ЗВЯЗДОЮ» ЛЕТА Ў РАДАСЦЬ!»

Крылатае: «Вось так заўсёды: ходзіш-ходзіш у школу, а потым — бац! — другая змена» вы, напэўна ж, помніце? А значыць, з ахвотай перайначыце: «Вось так заўсёды: чакаеш-чакаеш гэта лета, а потым...»

Не, тут і цяпер мы не будзем цытаваць славутага Пушкіна. Адзначым хіба, што спёка ды мухі з камарамі — гэта яшчэ паўбяды. Куды большая (асабліва для дачнікаў ды вяскоўцаў) — пустазелле ды розныя шкоднікі.

Вам не трэба казаць, якія?!

Тады — пра тое, што трэба.

У якасці прызоў для сваіх падпісчыкаў на трэці квартал і другое паўгоддзе рэдакцыя «Звязды» закупіла садовыя апрысквальнікі і электрычны трымер. Днямі і ў поўнай адпаведнасці з правіламі гульні адбыўся іх розыгрыш. То-бок у прысутнасці тыражнай камісіі ўсе дасланыя карткі-купоны (друкаваліся на працягу падпіснога кампаніі разам з праграмай тэлерадыёпередач), адсартаваныя па абласцях і горадзе Мінску, паасобку «ссыпаліся» ў чароўны саламяны капялюш, з якога па чарзе, навобмацак, даставалі шчаслівыя. Такім чынам

апрысквальнік садовы «Жук Класік» ОП-207/0444-00 выйграл:

Аляксандр Аляксандравіч Савейка, г/п Шаркаўшчына Віцебскай вобласці;

Алена Міхайлаўна Нікалаенка, в. Альшоў, Хоцімскі раён Магілёўскай вобласці;

Юрый Іванавіч Борсук, г. Брэст;

Яўген Мікалаевіч Гарбачык, в. Весякова, Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці;

Васіль Фёдаравіч Герман, в. Забор'е, Лагойскі раён Мінскай вобласці;

Васіль Васілевіч Шур, г. Мазыр Гомельскай вобласці;

Аліна Казіміраўна Пахвалёная, г. Мінск.

Суперпрыз — трымер электрычны Oasis TE-50 — выйграла

Ірaіда Вячаславаўна Лук'янава, аг. Калачы, Лагойскі раён Мінскай вобласці.

Нашы віншаванні ўсім, каму пашчасціла! Тым, каму не (ва ўсякім разе, пакуль...), раім не засмучацца: лета ў нас кароткае. Азірнуцца не паспеем, а ўжо новая падпісная кампанія, новая рэкламная гульня...

У ёй, ну вядома ж, можна не ўдзельнічаць. (Анекдот: на кветачцы бульбы, апусціўшы крылцы, сядзіць ледзь жывая багоўка. «Ну што — налётала ся?» — спачувае ёй каларадскі жук. — «А як жа, калі столькі просьбаў: паляці на неба ды паляці!.. Прынясі нам хлеба ды прынясі... Не, каб самім...»)

І сапраўды: не, каб самім... падпісацца на «Звязду», дасласць купон на розыгрыш прызоў і... выйграць!

Шансы на гэта мае кожны.

Афіцыйна

Арганізатарам рэкламнай гульні «Са «Звяздою» лета ў радасць!» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Рэкламная гульня «Са «Звяздою» лета ў радасць!» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 18.05.2022 г. (пасведчанне № 4195) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 чэрвеня да 30 верасня 2022 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на трэці квартал або другое паўгоддзе 2022 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 70 падпісчыкаў. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў:

8 (017) 271-81-53.

«Мая Маруся забіла гэту адзіноту...»

У Выдавецкім доме «Звязда» ўбачыла свет кніга «Табой я жыў, табой жыву...», якая прысвечана жонцы народнага паэта Беларусі Якуба Коласа — Марыі Дзмітрыеўне Міцкевіч (у дзявоцтве Каменская) (1891—1945). Укладальнікі цікавага, багатага на гістарычную памяць выдання — унучка Песняра Вера Міцкевіч і праўнучка Якуба Коласа Васіліна Міцкевіч.

Марыя Каменская з роднымі. Стаяць: браты Іван і Васіль. Сядзяць: маці Марыя Цімафееўна, брат Аляксандр, пляменніца Ганна (Нюся) і Марыя Дзмітрыеўна. Вільня, 1908—1910 гады.

...Дзяўчынкай Марыя Каменская, якая нарадзілася ў Ашмянах Віленскай губерні 7 лютага 1891 года, вучылася ў духоўным вучылішчы, пасля працавала настаўніцай чыгуначнай школы ў Вільні, затым — у Пінску. Там і пазнаёмілася з Якубам Коласам у 1912 годзе. Праз год яны пажаніліся. У 1914 годзе нарадзіўся першы сын — Даніла. У 1917 годзе — Юрый, у 1926-м — Міхась. У час Першай сусветнай вайны сям'я знаходзілася ў бежанстве ў Падмаскоўі, пасля ў Пярмі і Абаяні. Марыя Дзмітрыеўна працягвала настаўнічаць. У 1921 годзе сям'я вярнулася ў Мінск. З таго часу Марыя Дзмітрыеўна — хатняя гаспадыня. У гады Вялікай Айчыннай вайны жонка Коласа часта хварэла. Сям'я жыла ў эвакуацыі ў Ташкенце. На фронце прапаў без вестак сярэдні сын Юрка. У канцы 1944 года стан здароўя жонкі паэта істотна пагоршыўся. З пачатку 1945 года яна знаходзілася ў маскоўскіх шпіталях. Памерла ў Маскве 21 мая 1945 года.

Колас заўсёды аддаваў свае творы на першае чытанне Марыі Дзмітрыеўне, раіўся з ёй па розных мастацкіх пытаннях.

Марыя Каменская з сяброўкай.

Кніга, прысвечаная жонцы народнага Песняра Беларусі, складаецца з некалькіх раздзелаў. У першым укладальнікі змясцілі публіцыстычныя і гісторыка-літаратурныя артыкулы — «І дзе знайсці мне тыя словы...» Данілы Міцкевіча, «Я хачу аб табе з кім хоць слоўка сказаць...» Міхася Міцкевіча, «Яны спаткаліся, каб не расставацца» Святланы Явар, «... Мой добры друг, мая святыня...» і «Непаўторная кветка», аўтарам абодвух тэкстаў з'яўляецца Вера Міцкевіч, «Па сцяжынках Марыі Дзмітрыеўны» Марыі Міцкевіч. Другі раздзел — «А з думак тых звіваецца вянок...» — сабраў разам сямейнае ліставанне. У трэцім — «Як гэта добра — атрымаць пісьмо!»: выбранае з ліставання Марыі Міцкевіч і яе адрасатаў. У чацвёртым раздзеле — «Слова пра жонку песняра» — кароткія ўспаміны ад Эдзі Агняцвет, Заіра Азгура, братоў і сясцёр Якуба Коласа, Петруся Броўкі, Марыі Ваганавай, Вольгі Галіны, Галіны Максімаўны Гарэцкай, Зульфіі і іншых людзей, каму пашчасціла ведаць Марыю Дзмітрыеўну.

У пятым — дакументы і спачуванні на смерць жонкі паэта. Шосты раздзел вызначаецца асаблівай эмацыянальнасцю: у ім — творы, прысвечаныя Марыі Дзмітрыеўне: Якуба Коласа (і «Маёй Марусі», і ўрывак з паэмы «Рыбакова хата», і іншыя творы), Эдзі Агняцвет, Сяргея Гарадзецкага, Яўгена Хвалея, Людмілы Дзіцэвіч, Дзмітрыя Дземіловіча, Міколы Мятліцкага, Міколы Маляўкі, Міколы Адама, Віктара Шніпа. З «Пасляслоўем» выступае Васіліна Міцкевіч, праўнучка паэта і Марыі Дзмітрыеўны. Варта заўважыць, што кандыдат сацыялагічных навук, галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Васіліна Валер'еўна Міцкевіч у апошнія некалькі гадоў заявіла аб сабе як аб глыбокай даследчыцы жыцця народнага песняра, яго зносін з роднымі, блізкімі, калегамі па творчым цэху.

З грунтоўнай, усеабдымнай і разам з тым пранікнёнай, «вельмі коласаўскай», прадмовай да кнігі — «Сувоі памяці» — выступае дасведчаны гісторык літаратуры, кандыдат філалагічных навук Мікола Трус. І вось што ён, у прыватнасці, адзначае: «Творчая спадчына Якуба Коласа, прадстаўленая ў асобных кнігах і зборах твораў, апошні з якіх налічвае 20 тамоў, стварае бязмежную прастору для вывучэння, асэнсавання і бясконцых аўтарскіх інтэрпрэтацый. Усе коласазнаўчыя публікацыі — гэта аб'ёмісты корпус тэкстаў, прысвечаных спасціжэнню класікі, гісторыі беларускай літаратуры.

Пры ўсіх багацці і плюралізме даследчыцкіх меркаванняў, адкрытай магчымасці іх папаўнення і актуалізацыі, надзвычай каштоўным, на нашу думку, з'яўляецца выяўленне і публікацыя невядомых архіўных матэрыялаў. У гэтым бачыцца зарука абнаўлення погляду, карэкціроўкі ракурсаў асэнсавання мінулага і непадуладнай часу мастацкай творчасці.

Калі для шырокай грамадскасці і навуковай супольнасці ўвагу да спадчыны класіка беларускай літаратуры прыцягваюць юбілейныя даты, штогадовыя «Каласавіны», ушанаванне памяці Якуба Коласа ў дні яго нараджэння і спачыну, то для нашчадкаў Песняра гэта штодзённы сямейны клопат і прафесійная руплівасць. Акадэмічны «Летапіс жыцця і творчасці» — выверaны гадамі працы даведнік для даследчыкаў. Сямейны агмень, які годна падтрымліваюць Марыя, Вера і Васіліна Міцкевіч, — нязменны арыенцір для чулых душ, прывабленых энергетыкай Коласавага слова. Руплівымі жаночымі рукамі тчэцца сувой радавой памяці, паўнее куфар нацыянальных здабыткаў...» І далей: «У гісторыі беларускай і сусветнай культуры набярэцца нямала прыкладаў, калі нашчадкі пісьменнікаў станавіліся асноўнымі захавальнікамі іх матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны, прыкладвалі вялікія арганізацыйныя высілкі пры мемарыялізацыі мясцін і хатняга побыту вядомых асоб, выданні пісьмовых крыніц. Ужо сама іх прысутнасць у музейнай прасторы заўсёды стварала і працягвае ствараць непаўторнае адчуванне персанальнай далучанасці, душэўнага дакранання наведвальнікаў экспазіцый і ўдзельнікаў мерапрыемстваў да няўлоўнага, але такога важнага працэсу пераемнасці гісторыі і традыцый.

Даніла і Міхась Міцкевічы. Сыны Песняра, звенчакі памяці і спраўджаныя спадзяванні бацькоў на лепшую долю беларусаў, іх выдатную адукацыю, навуковую і творчую рэалізаванасць. Кожны, хто знаёмы з іх словамі і справамі, займеў для сябе высокі маральны аўтарытэт, прыклад слугавання Бацькаўшчыне».

Якуб Колас са сваёй сям'ёй: жонкай Марыяй і сынамі Данілам, Юркам і Міхасём. Мінск, 1928 год.

Укладальнікі выбудавалі адметную архітэктуру кнігі, рэльефна вымалёўваючы вобраз Марыі Дзмітрыеўны Міцкевіч. «Табой я жыў, табой жыву...» — гэта кніга-партрэт, кніга-біяграфія, напісаная рознымі аўтарамі ў адной плыні сапраўднай любові да свайго персанажа, захаплення постаццю жонкі вялікага мастака слова. Дадзенае выданне смела можна было б уключаць у серыю «Мастацкай літаратуры» з красамоўнай і зразумелай назвай — «Жыццё знакамітых людзей Беларусі». Мо такая ўдача і вывела на рэалізацыю магістральнай ідэі, што сямейнікі, нашчадкі народнага Песняра падступаліся да яе вырашэння не адзін год, не адно дзесяцігоддзе. Канец XX — пачатак XXI стагоддзя знамянальны ў айчынным коласазнаўстве і тым, што былі выдадзены кнігі сыноў паэта — шматгадовага дырэктара, супрацоўніка Коласаўскага музея Данілы Міцкевіча і доктара тэхнічных навук, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусі Міхася Міцкевіча, альбо кнігі з іх непасрэдным удзелам як укладальнікаў, рэдактараў. Асобы з выразнай беларускай грамадзянскай пазіцыяй, надзвычай чуйныя да радавой памяці, да асэнсавання месца і ролі Якуба Коласа і яго атачэння ў гісторыі беларускай літаратуры, сведкі многіх грамадскіх, сацыяльных, жыццёвых калізій на працягу многіх дзесяцігоддзяў у лёсе Беларусі, яны заклалі грунт, мацавалі ідэю жывой неўміручасці аўтара «Новай зямлі».



...Даніла Міцкевіч («І дзе знайсці мне тыя словы: Успаміны пра маму»): «Дзяўчынкаю маме давялося вучыцца ў духоўным вучылішчы. Руская па нацыянальнасці, яна дасканала ведала і любіла беларускую мову, якая стала для яе роднай. Многім даказвала, што беларуская мова захавала больш ад старажытнаславянскай асновы, чым руская. У доме гаворкі вяліся па-беларуску, і маці часта папраўляла нас у сэнсе правільнага вымаўлення слоў. Яна ведала шмат нашых народных песень, часта спявала. Памятаю: «Ой, зацвіла ружа, белы цвет». Язэп Лёсік нярэдка прасіў, каб яна выканала песню «З гары па даліне галубы ляталі». Сардэчна і чула да мамы ставіліся Янка Купала, Максім і Гаўрыла Гарэцкія, Змітрок Бядуля, Аркадзь Смоліч, Алесь Сянкевіч і, па сутнасці, усе, хто бываў у нас і сустракаўся з ёю.

Яна была чалавекам, поўным любові да людзей, з пяшчотай ставілася да нас, сваіх дзяцей, вучыла нас быць добрымі, сумленнымі, працавітымі. Нам пашчасціла ў тым, што ў бацькоў ніколі не было сварак, лаянкі, што ў нашай сям'і заўсёды панавала атмасфера любові і дабрыні. Якое ж гэта шчасце! Яго, тое шчасце, найперш стварала наша мілая мама...»

Сапраўдны падарунак для чытача — кніга «Табой я жыў, табой жыву...», выдадзеная па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца яркай падзеяй айчыннага кнігавыдавецтва, падзеяй коласазнаўства ў час святкавання краінай 140-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. І яшчэ... Томік пра Марыю Дзмітрыеўну Міцкевіч — гэта і добры падручнік сямейнай педагогікі. Не абмініце кнігу, поўную любові і харaства жыцця!.. Мець такую кнігу варта ў кожнай школе краіны. Па яе старонках можна вывучаць і пытанні сямейнага выхавання, і гісторыю беларускай літаратуры. Яе старонкі будуць натаўляць прагу да жывога, багатага на энергетыку роднасці і чуласці, беларускага слова.

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

САЛОДКІ ВІЦЕБСКІ КУТОК

У горадзе Глыбокае Віцебскай вобласці прайшоў юбілейны дзясяты «Вішнёвы фестываль», які даўно стаў візітнай карткай паўночнага рэгіёна

Цікава, што менавіта вішня стала глыбоцкім брэндам, а не славутая згушчонка ў блакітна-белай бляшанцы. Аказваецца, што ў 20-30-я гады XIX стагоддзя селекцыянер Баляслаў Лапыр вывеў асабістыя зімаўстойлівыя сарты вішань — гібрыды чарэшні і вішні, якія вылучаліся сакавітымі і буйнымі пладамі. З таго часу гэтыя дрэўцы займаюць пачэснае месца ў кожным двары Глыбоччыны, а факт, што менавіта глыбоцкія вішні самыя смачныя, агульнапрызнаны даўно.

Свой адлік фестываль вядзе з 2012 года, калі праект заняў другое месца ў фінале рэспубліканскага конкурсу творчых работ па развіцці гарадоў і рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь. Салодкі фэст запусціў працэс вяртання Глыбокаму ганаровага звання «Горад-сад» — і, як паказвае 10-гадовы фестывальны вопыт, даволі паспяхова. У 2013 годзе ў горадзе ўстанавілі скульптуру «Вішанька», якая з'яўляецца сімвалам фестывалю і галоўнай славутасцю для зацікаўленых турыстаў і жыхароў Глыбоччыны.

Пачаўся фестываль прэстыж-сустрэчай у рэзідэнцыі Вішнёвай каралевы. Там госці змаглі адправіць брэндавыя паштоўкі са святочным штэмпелем сваім блізкім і сябрам, перадаўшы прывітанне з вішнёвай сталіцы. Пакуль адны займаліся поштай, другія стралялі ў мішэнь вішнёвымі костачкамі-веліканамі. Пераможцай у гэтым конкурсе стала госця з Мінска. Дарэчы, турыстычнае бюро арганізавала для ахвотных тур у Глыбокае, што вельмі спадабалася жыхарам сталіцы. На майстар-класы па саломапляценні і стварэнні лялек з нітак запрашалі работнікі мясцовага Дома рамёстваў. Этнавечарына «У вішнёвым садзе», інтэлектуальна-прыгодніцкі квэст, конкурс паветраных змеяў, урачыстае шэсце — вочы і ногі імкнуліся ў розныя бакі! Для навучэнцаў мастацкай школы кітайскі мастак Пань Уліцзі правёў майстар-клас па акварэльным жывапісе, а ўсе жадаючыя маглі наведаць выставу яго работ.

Пераспрабаваць усе сарты вішань і прысмакі з іх было немагчыма: печыва, пірагі, цукеркі ў форме ягад — на любы смак, а падчас конкурсу-дэгустацыі «Варым вішнёвае варэнне разам» можна было не толькі пакаштаваць кулінарныя вынаходніцтвы гаспадынь, але і назапасіць шмат цікавых рэцэптаў. Рупліва рыхтаваліся да свята не толькі гаспадары і арганізацыі раёна, але і Глыбоцкі мясакамбінат, які штогод гатуе да фестывалю мясныя навінкі. Сёлета прэзентавалі сыравялены рублены «Тартар Глыбоцкі» з вішняй. Прадукт з серыі элітных вырабляецца са свежаастуджанай ялавічыны, якая пасля засолу прыпраўляецца вострымі спецыямі і свежымі або сушанымі ягадамі. Пасля мясны прадукт падвэндзваюць дымам ад спальвання букавых шчэпак, і духмяны далікатэс гатовы ўпрыгожыць любы святочны стол.

Адной з самых шчырых традыцый фестывалю з'яўляецца «вішнёвае» вяселле, ды не тэатралізаванае — сапраўднае! Маладыя часта абіраюць для сябе адметныя даты, а для Дар'і Герман і Андрэя Санько дзень нараджэння іх сям'і супаў з юбілейным фестывалем. Урачыстая цырымонія шлюбу прайшла па традыцыі на беразе возера Кагальнае ў скверы маладых. Свае віншаванні і падарункі даслала новай сям'і гаспадыня свята — Вішнёвая каралева, а яшчэ менавіта гэта цырымонія стала для мясцовага аддзела ЗАГСа 100-й. А ўсяго за два фестывальныя дні на Глыбоччыне «нарадзілася» 10 сямей.

У міжнародным конкурсе на найлепшае валоданне баянам, акардэонам і гармонікам узялі ўдзел прафесіяналы і самавучкі дзвюх узроставых катэгорый не толькі з Беларусі, але і з блізкага замежжа. Галоўны прыз — новенькі «вішнёвы» баян — атрымала вучаніца Глыбоцкай дзіцячай школы мастацтваў Паліна Сіняўская, а гэта значыць, баян зноў застаўся ў Глыбокім. Упершыню на юбілейным святе прайшла выстава-конкурс работ, выкананых у тэхніцы шыцця са шматкоў, — «Вішнёвая мазаіка».

На два дні салодкая сталіца Віцебшчыны ператварылася ў рознакаляровы гарадок, напоўнены танцамі і звонкімі песнямі, пакінуўшы ў кожнага ўдзельніка фестывалю на вуснах адметны вішнёвы смак.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ ТОРГОВ

Организатор торгов	**Антикризисный управляющий Открытого акционерного общества «МОТОВЕЛО» – ООО «Антикризисное управление», 220012, Минск, ул. Чернышевского, д. 5, офис 4, сектор «Б»**
Продавец	**ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 17 298-14-22)**
Торги проводятся в форме открытого аукциона отдельными лотами на повышение стоимости с открытой формой предложения	
Сведения о предмете торгов и начальной цене	

Дебиторская задолженность:

Лот № 1: частное торгово-производственное унитарное предприятие «Бобровник В.В.» (УНП 490907817) на сумму 7 348,43 руб., начальная цена – 73,48 руб.

Лот № 2: Жлобинский хлебозавод – Филиал ОАО «Гомельхлебпром» (400173506) на сумму 7 100,00 руб., начальная цена – 71,00 руб.

Лот № 4: Лаврут Сергей Николаевич на сумму 111,30 руб., начальная цена – 1,11 руб.

Лот № 6: частное торговое унитарное предприятие «Чаша счастья» (490980171) на сумму 319,39 руб., начальная цена – 3,19 руб.

Лот № 8: общество с ограниченной ответственностью «ГосподарЭкспорт» (191633079) на сумму 2 411,61 руб., начальная цена – 24,12 руб.

Лот № 9: общество с ограниченной ответственностью «ГосподарЭкспорт» (191633079) на сумму 1 449,58 руб., начальная цена – 14,50 руб.

Лот № 10: общество с ограниченной ответственностью «ГосподарЭкспорт» (191633079) на сумму 388,80 руб., начальная цена – 3,89 руб.

Лот № 11: общество с ограниченной ответственностью «ГосподарЭкспорт» (191633079) на сумму 201,01 руб., начальная цена – 2,01 руб.

Лот № 12: общество с ограниченной ответственностью «Мила Плюс Принт» (УНП 191803074) на сумму 297,77 руб., начальная цена – 2,98 руб.

Лот № 13: общество с ограниченной ответственностью «Энерджилайф» (УНП 191446423) на сумму 353,52 руб., начальная цена – 3,54 руб.

Лот № 14: общество с ограниченной ответственностью «КлинХаус» (УНП 191692668) на сумму 18,00 руб., начальная цена – 0,18 руб.

Лот № 18: общество с ограниченной ответственностью «Клин-Стрим» (УНП 192436934) на сумму 662,40 руб., начальная цена – 6,62 руб.

Лот № 19: общество с ограниченной ответственностью «Клин-Стрим» (УНП 192436934) на сумму 29,40 руб., начальная цена – 0,29 руб.

